Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЛІПЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 124 (27982) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НАША ГАЛОЎНАЕ СВЯТА

***Паважаныя суайчыннікі!***

Ад усёй душы віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Гэтае свята па праве з'яўляецца самым дарагім у жыцці нашага народа, выклікае найвышэйшы духоўны ўздым і яднанне ўсіх, хто шануе слаўную гісторыю сваёй Радзімы і верыць у яе дастойную будучыню.

У пасляваенныя гады, нягледзячы на вялікія людскія страты, матэрыяльныя цяжкасці і нягоды, з руін і попелу была адноўлена народная гаспадарка. За гістарычна кароткі тэрмін Беларусь зрабіла магутны рывок у сваім развіцці, ажыццявіўшы мару многіх пакаленняў аб стварэнні суверэннай і незалежнай дзяржавы.

У аснове нашых дасягненняў — мужны дух, працавітасць і ўпартасць беларускага народа.

Галоўная задача для нас сёння — годна пранесці і перадаць сваім дзецям і ўнукам гістарычную эстафету, атрыманую ад пакалення пераможцаў і стваральнікаў, захаваць мір і спакой на роднай зямлі.

Шчыра зычу вам шчасця, здароўя, поспехаў і новых працоўных здзяйсненняў на карысць Айчыны!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Шчасце жыць на сваёй зямлі

## Зберагчы мір, згоду і парадак — гэта не толькі задача дзяржавы і ўлады, але і абавязак кожнага чалавека, які шчыра любіць сваю Радзіму

**Гэтыя зразумелыя і блізкія ўсім словы сталі лейтматывам выступлення Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню Незалежнасці Беларусі.**

Прэзідэнт адзначыў, што першыя ліпеньскія дні асаблівыя ў беларускім календары. «Колькі б часу ні прайшло пасля Вялікай Айчыннай вайны, мы зноў і зноў вяртаемся ў далёкае лета 1944-га, — сказаў беларускі лідар. — Воляй беларускага народа менавіта гэтая дата стала галоўным дзяржаўным святам незалежнай Беларусі».

«Для нас святая памяць аб жахлівых ахвярах вайны, вялікім подзвігу мільёнаў салдат і афіцэраў, партызан і падпольшчыкаў, мірных грамадзян, якія адстаялі свабоду нашай Айчыны, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Прынята лічыць, што незалежнасць і суверэнітэт дасталіся беларусам мірна, без войнаў, узрушэнняў — амаль дарма. Аднак наш шлях да незалежнасці быў доўгім, цяжкім і крывавым. Толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны мы страцілі мільёны людзей, кожны трэці загінуў або памёр скалечаным».

«Мы ніколі не павінны забываць — менавіта ў Беларусі супраціў агрэсарам аказаўся самым масавым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ў гады акупацыі ішла сапраўдная бітва за свабоду і незалежнасць роднай зямлі, яна з'яднала народ, спарадзіла нябачаны ў гісторыі ўздым патрыятызму і мужнасці. «Нашы партызаны і падпольшчыкі свой другі фронт, фронт супраціву, адкрылі ўжо ў першыя дні вайны, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У шэрагах Чырвонай Арміі змагалася амаль паўтара мільёна беларускіх воінаў. Выхадцы з Беларусі самааддана працавалі ў эвакуацыі, удзельнічаючы ў забеспячэнні фронту зброяй і харчаваннем».

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# З ГОНАРАМ І ЎДЗЯЧНАСЦЮ

## Разам з удзельнікам вызвалення Мінска Аляксандрам Фенем мы прайшлі па тых месцах, дзе больш за сем дзесяцігоддзяў таму разгарнуліся жорсткія баі за нашу сталіцу

Ціхая ліпеньская раніца. Па лясной сцяжынцы побач са мной крочыць ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Фень. Менавіта тут, непадалёк ад Астрашыцкага Гарадка, больш як 70 гадоў таму разгарнуліся баі за вызваленне Мінска. Аляксандр Фёдаравіч добра памятае, з якой мужнасцю савецкія салдаты змагаліся за кожную пядзю зямлі, што набліжала іх да запаветнай Перамогі.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мы спыняемся каля невялічкага помніка, які схаваўся паміж векавымі хвоямі. Сёння тут шматлюдна. Каб ушанаваць памяць воінаў-танкістаў, якія загінулі за дзень да вызвалення Мінска, сюды прыехалі вайскоўцы, моладзь, прыйшлі мясцовыя жыхары. Насупраць помніка — лясная паляна. Гэта сёння тут усё ў кветцы, стракочуць конікі, пяюць птушкі. Тады тут былі іншыя гукі. Страшныя гукі.

— Мы знаходзімся на той паляне, дзе танкісты баявога разведдазору 31-й танкавай Кіравагградскай двойчы Чырванасцяжнай ордэна Суворава танкавай брыгады здзейснілі геаічны подзвіг і аддалі свае жыцці дзеля выканання баявой задачы, — пачаў аповед Аляксандр Фень. — Як гэта было? Наступаючы на праціўніка, Другі танкавы батальён брыгады адправіў наперад баявы разведдазор — танкавы ўзвод (тры танкі) малодшага лейтэнанта Гарачава. На другім танку з мэтай разведкі рухаўся экіпаж дваццацігадовага Аляксандра Маторына. Яго экіпаж складаўся з адных камсамольцаў. Механіку-кіроўцу Івану Пятрову і камандзіру вежы (ён і зараджаў) Аляксандру Карагодзіну было па 18 гадоў, радысту-кулямётчыку Мікалаю Разуваеву споўнілася 20.

СТАР. 15

ISSN 1990 - 763X

# Шчасце жыць на сваёй зямлі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«І мы, і нашы нашчадкі заўсёды павінны памятаць — галоўная гістарычная заслуга ў выратаванні чалавецтва ад нацызму належыць савецкаму народу! І менавіта Савецкі Саюз, у склад якога ўваходзіла і наша Беларусь, прынёс самую вялікую ахвяру на алтар Перамогі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ніколі не забудзецца і працоўны подзвіг тых пакаленняў. «Пасля вызвалення Беларусі яны паднялі краіну з руін. Абапіраючыся на падтрымку брацкіх саюзных рэспублік, беларусы вярнулі да жыцця родны край. У пасляваенныя гады ў нас быў створаны магутны навукова-вытворчы патэнцыял, з'явіліся новыя галіны эканомікі, атрымалі развіццё адукацыя, культура, сацыяльная сфера», — адзначыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу на тое, што рэспубліка выйшла на лідзіруючыя эканамічныя пазіцыі ў Савецкім Саюзе.

«Міралюбівая палітыка маладой незалежнай дзяржавы выпакутавана ўсёй гісторыяй нашага народа, як і яе незалежнасць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, важным палітычным вынікам Другой сусветнай вайны стала прызнанне міжнароднай супольнасцю значнага ўкладу беларускага народа ў перамогу над фашызмам. Краіна ўвайшла ў лік заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. «Беларусь па праве з'яўляецца паўнавартасным суб'ектам міжнароднай палітыкі», — сказаў беларускі лідар.

На думку кіраўніка дзяржавы, тое, што Беларусь стала цэнтрам для ўрэгулявання міжнародных канфліктаў, паказвае, што свет бачыць шчырасць, сумленнасць і адкрытасць беларускай палітыкі. «Беларусь ніколі не стане спекуляваць на міждзяржаўных супярэчнасцях, ніколі не будзе шукаць сваю выгаду ў шкоду каму б там ні было», — сказаў ён. «Але мы патрабуем такога ж шчырага, адкрытага, паважлівага стаўлення і да нашай краіны. Мы гатовыя сябраваць, дапамагаць і супрацоўнічаць з усімі, але толькі на прынцыпах узаемнай выгады і роўнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што найноўшая гісторыя незалежнай Беларусі яскрава паказала: любыя спробы ізаляцыі дзяржавы контрпрадукцыйныя. Ён звярнуў увагу, што сёння Беларусь энергічна пашырае геаграфію кантактаў, умацоўваючы адносіны з такімі буйнымі дзяржавамі, як Кітай і Індыя, развіваецца цеснае супрацоўніцтва з краінамі Лацінскай Амерыкі, вядзецца пошук агульных кропак судакранання з дзяржавамі Афрыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі. Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь ужо адчувае ад гэтага практычны вынік.

Умацаванню пазіцый Беларусі на сусветнай арэне служыць удзел у маштабных інтэграцыйных працэсах. Наша краіна стала ініцыятарам стварэння такіх інтэграцыйных структур на постсавецкай прасторы, як Саюзная дзяржава, Мытны саюз, а затым і Еўразійскі эканамічны саюз. Беларусь уключана ў глабальную эканамічную ініцыятыву Кітая па стварэнні новага Шаўковага шляху, якая выдатна дапаўняе праект Еўразійскага эканамічнага саюза, паколькі гандлёвыя шляхі будуць пралягаць па іх тэрыторыі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы са шкадаваннем заўважыў, што свет не стаў спакайнейшым. «Упершыню з часоў Вялікай Айчыннай ідуць баі не толькі недзе далёка, але прама каля нашых межаў. Вяртанне халоднай вайны становіцца ўсё больш відавочным. «У ахвяру геапалітычным інтарэсам звышдзяржаў прыносіцца стабільнасць і дабрабыт вялізных рэгіёнаў планеты», — сказаў Прэзідэнт.

Таму, ажыццяўляючы шматвектарную міралюбівую палітыку, наша краіна вымушана ўсямерна ўмацоўваць свае Узброеныя Сілы. Беларуская армія папаўняецца новай тэхнікай і ўзбраеннем, камплектуецца кадрамі высокай кваліфікацыі. У краіне створаны і дзейнічаюць надзейныя сістэмы пагранічнай аховы і тэрытарыяльнай абароны. «Таму магу ўпэўнена сказаць нашым нядобразычліўцам, калі яны яшчэ засталіся: бразганне зброяй каля беларускіх рубяжоў — дарэмная трата часу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Але галоўны падмурак бяспекі і незалежнасці Беларусі — гэта адзінства і згода ў грамадстве, мір і парадак унутры краіны, устойлівае развіццё эканомікі», — лічыць беларускі лідар.

«Мадэль сацыяльнай дзяржавы, якую мы выбралі, дазваляе абараніць простага чалавека не толькі ў спрыяльных, але і ў складаных эканамічных умовах. І адступлення ад гэтай мадэлі не будзе», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён дадаў, што «нас вельмі штурхаюць да таго, каб мы ад гэтай мадэлі адмовіліся».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сусветны і рэгіянальны эканамічныя крызісы ў апошні час моцна ўдарылі не толькі па Беларусі. «Але наша адкрытая эканоміка, адчувальная да ваганняў знешніх рынкаў, пакутуе і ад санкцыйных войнаў, якія праводзяцца Захадам і Расіяй», — сказаў беларускі лідар.

«Але цяжкасці гэтыя часовыя і абсалютна пераадольныя, — падкрэсліў Прэзідэнт. — У нашай нядаўняй гісторыі мы вытрымлівалі годна і не такія выпрабаванні!». Прэзідэнт нагадаў, у якім адчайным становішчы апынулася Беларусь у канцы мінулага стагоддзя — у пачатку 90-х краіна была на краі бездані. «Але наш народ выстаяў, як і ў пасляваенныя гады, выстаяў і пабудаваў сваю дзяржаву», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Мы распрацавалі ўласную мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэтая мадэль не была прапісаная ў падручніках, яна нараджалася з жыцця, з нашага вопыту, яе дыктавалі народная мудрасць і здаровы сэнс», — адзначыў Прэзідэнт.

«Мы абаранілі краіну ад разрабавання. Беларусь — адзіная з краін сацыялістычнага лагера, СНД, якая паставіла заслон расцягванню і раскраданню агульнанароднай уласнасці, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы стварылі моцную вертыкаль улады, адрадзілі дзяржаўнае планаванне». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што пра гэта загаварылі і ў Расіі. «Аказваецца, планаванне — гэта не зусім дрэнна, і трэба адраджаць яго па элементах. Мы яго адрадзілі раней, з нас усе смяяліся: пяцігодкі ўстанавілі, кожны год даводзіць планы. А як жыць грамадству і наогул нават чалавеку, не ставячы перад сабой нейкіх мэтаў? План — гэта мэта, да якой мы павінны імкнуцца, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы разумна спалучаем гэта планаванне з падтрымкай прыватнай ініцыятывы».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў выніку Беларусь першай на постсавецкай прасторы не толькі дасягнула даперабудоўнага ўзроўню эканомікі, але і ўдвая перасягнула яго. «Вядома, заўсёды хочацца большага. Вельмі многае яшчэ не зроблена. Шмат чаго трэба будзе дасягнуць. Нам ёсць куды расці і развівацца», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што па якасці жыцця Беларусь у сусветным рэйтынгу значна апярэджвае як партнёраў па Еўразійскім эканамічным саюзе, так і іншыя дзяржавы постсавецкай прасторы, прычым па ацэнцы сусветных незалежных экспертаў. «Сённяшнія праблемы ў эканоміцы, вядома, складаныя. Але яны не ідуць ні ў якое параўнанне з тым, з чым нам даводзілася спраўляцца ў дзевяностыя. Выстаялі тады — выстаім і сёння!» — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт канстатаваў, што з розных прычын на некаторых беларускіх прадпрыемствах склалася няпростая сітуацыя. Ён адзначыў, што напярэдадні святаў быў прыняты шэраг рашэнняў па выхадзе многіх прадпрыемстваў з крызісу. «Ніякіх неабдуманых крокаў тут быць не павінна. Ніякіх масавых закрыццяў, звальненняў і скарачэнняў. Мы павінны захаваць працоўныя калектывы і працоўныя месцы — гэта галоўная задача, таму што крызісы прыходзяць і сыходзяць, а калі крызіс скончыцца і будуць разбураны працоўныя калектывы і прадпрыемствы, вытворчасці, тады не будзе на што абапірацца і будаваць, абараняць сваю незалежнасць», — адзначыў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў Беларусі будуць працаваць толькі адказныя інвестары. «Я любому інвестару, заходняму, унутранаму і ўсходняму, кажу адно: стаўцеся да нашай дзяржавы і нашага народа, як да сваёй сям'і. Не набівайце кішэні, дайце спачатку штосьці людзям, да якіх вы прыйшлі і абяцалі падарыць шчасце. Не будзе гэтага — працаваць у нас не будзеце і такія інвестыцыі ў нашу эканоміку нам не патрэбныя. Мы самі будзем спраўляцца са сваёй эканомікай», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Прыйшлі працаваць — працуйце», — дадаў ён.

«Як вядома, хто хоча, той шукае магчымасці, а хто не хоча — апраўдання. Сённяшняя сітуацыя — гэта час магчымасцяў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, бачачы, як сціскаецца расійскі рынак, Беларусь актывізавала працу па дыверсіфікацыі экспарту. «Наш новы падыход да экспарту вызначае: трэць прадукцыі павінна адпраўляцца на рынкі Еўразійскага эканамічнага саюза, трэць — у краіны Еўрасаюза, яшчэ трэць — у краіны «далёкай дугі» (дзяржавы Азіі, Блізкага Усходу, Лацінскай Амерыкі, Афрыкі). Менавіта збалансаваная геаграфія экспарту дазволіць Беларусі да 2020 года выйсці на дадатнае сальда знешняга гандлю», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што цяпер запатрабаваныя новыя высокатэхналагічныя вытворчасці. «Будучыня — за навукаёмістымі галінамі. Менавіта яны павінны стаць лакаматывам развіцця эканомікі, забяспечыць кваліфікаваныя кадры працоўнымі месцамі, садзейнічаць прытоку валюты ў краіну», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Не апсрэчваючы важнасць інвестыцый у вытворчасць, хачу падкрэсліць, што найважнейшым для нас з'яўляецца інтэлектуальны рэсурс. Менавіта ён ляжыць у аснове новай эканомікі. Невыпадкова мы плануем звязваць развіццё яе сектараў і галін з прыкладнымі і фундаментальнымі даследаваннямі, дзяржаўнымі навукова-тэхнічнымі праграмамі», — сказаў беларускі лідар. На яго думку, гэтаму павінны служыць як удасканаленне сферы адукацыі, якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, так і павышэнне аддачы навуковых арганізацый у мадэрнізацыі эканомікі і ўкараненні перадавых тэхналогій.

«Мы камусьці як костка ў горле. Вось гэта бедная цэнтральнаеўрапейская невялікая дзяржава, і яны, аказваецца, яшчэ да гэтага часу жывуць, яны яшчэ не ваююць! Гэтым людзям хачу сказаць: вайны ў Беларусі не будзе, мы сваё шчасце знойдзем мірным шляхам, як гэта рабілі заўсёды», — сказаў беларускі лідар. «Мы ганарымся тым, што мір, спакой і парадак — галоўны набытак нашай краіны. Без іх немагчыма ні развіццё, ні росквіт. Гэта той падмурак, на якім заснавана ўсё: і эканоміка краіны, і матэрыяльны дастатак кожнага, і шчаслівае жыццё нас і нашых дзяцей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Зберагчы мір, згоду, парадак — гэта не толькі задача дзяржавы і ўлады, калі хочаце, і абавязак кожнага чалавека, хто шчыра любіць сваю зямлю і свой родны дом», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў апошні час шмат гаворыцца аб незалежнасці, што гэта свабода, дабрабыт, мір, стабільнасць, права жыць у сваім доме. «Усё гэта правільна, усё гэта так. З майго пункту гледжання, незалежнасць — гэта магчымасць. Усё, што мы атрымліваем ад незалежнасці, само не прыходзіць. Яно вынік карпатлівай, цяжкай працы па выкарыстанні магчымасцяў. Пры гэтым варта памятаць — незалежнасць каштуе дорага. І тая цана, якую заплаціў наш народ, — гэта цана, каб быць незалежным, а каб захаваць незалежнасць — плацім і будзем плаціць шмат. Іншага не дадзена, калі мы хочам жыць у сваёй краіне, на сваёй зямлі, рабіць яе больш прыгожай і завяшчаць сваім дзецям», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, галоўнай задачай развіцця эканомікі быў, ёсць і павінен заставацца рост якасці жыцця і дабрабыту людзей. «Гэтым прынцыпам мы ніколі не паступімся, — падкрэсліў беларускі лідар. — Беларусь — дзяржава для народа».

Пры гэтым ён адзначыў, што дастатак і дабрабыт у доме ў першую чаргу залежаць ад самога чалавека, яго ініцыятывы, адказнасці і энергіі, ад таго, наколькі ён гатовы выкарыстоўваць магчымасці, якія дае яму дзяржава.

«Усё лепшае, чым адзначана найноўшая гісторыя Беларусі, — наша агульная заслуга. Разам мы моцныя і непераможныя», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў ветэранам, пажадаўшы ім здароўя на доўгія гады. «Чым даўжэй жывуць нашы ветэраны і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, тым мацней будзе наша краіна. Калі б не яны і іх памяць, нам было б у разы складаней», — адзначыў ён. Прэзідэнт павіншаваў усіх жыхароў краіны з галоўным дзяржаўным святам — Днём Незалежнасці Беларусі.

**Паводле паведамлення прэс-службы Прэзідэнта.**

## Ад дыялогу — да дэбатаў

# МАЕШ ПАЗІЦЫЮ? АДСТОЙВАЙ!

**Напярэдадні Дня Незалежнасці Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі распачаў свой новы праект пад назвай «ВЫБІРАЙ.BY». У Рэспубліканскім доме моладзі адбылася яго прэзентацыя, у якой паўдзельнічалі маладзёжныя актывісты, а таксама запрошаныя эксперты — прадстаўнікі дзяржаўных ведамстваў і СМІ.**

Да канца года на раённым, гарадскім і абласным узроўнях пройдуць дэбаты на самыя розныя актуальныя для грамадства, і ў першую чаргу для моладзі, тэмы. Фактычна яны стануць адмысловай дыскусійнай пляцоўкай для прадстаўнікоў новага пакалення. Напрыканцы года БРСМ вызначыць найлепшых аратараў у краіне. Арганізатары абяцаюць, што падчас рэалізацыі праекта будуць выкарыстоўвацца найноўшыя інтэрактыўныя сродкі, а таксама інтэрнэт.

Па словах **першага сакратара БРСМ Андрэя БЕЛЯКОВА,** праект «ВЫБІРАЙ.BY» стаў лагічным працягам практыкі «адкрытых дыялогаў», што актыўна праводзіліся сёлета:

— Адзначу, што адкрыты дыялог — гэта проста абмен думкамі. А дэбаты — гэта адстойванне свайго пункту гледжання, своеасаблівае спаборніцтва. У нас ёсць вялізная колькасць падстаў для гонару — у спорце, эканоміцы, адукацыі, сферы IT. Але, безумоўна, ёсць і праблемы. І мы хочам, каб моладзь падыскутавала на гэтыя тэмы, пацвярджаючы, што мы гатовы вырашаць самыя розныя пытанні супольна, разам ісці наперад і будаваць сваю суверэнную краіну. Невыпадкова, што «ВЫБІРАЙ.BY» стартуе напярэдадні Дня Незалежнасці. Варта таксама сказаць, што ўменне адстойваць свае погляды, шукаць патрэбныя аргументы абавязкова спатрэбіцца маладым у будучыні. Праблемы, якія ўздымае моладзь, абавязкова знойдуць сваё вырашэнне, бо на дэбатах будуць прысутнічаць эксперты, у якасці якіх выступяць кіраўнікі органаў выканаўчай улады, прадпрыемстваў, арганізацый.

Галоўным мерапрыемствам прэзентацыі стала своеасаблівае галасаванне — удзельнікі прэзентацыі напісалі на аркушах паперы першыя тэмы, якія яны лічаць найбольш актуальнымі для маладзёжнага абмеркавання на дэбатах. Пасля гэтага «бюлетэні» змясцілі ў сімвалічную «скрыню для галасавання».

— Мне хочацца павіншаваць БРСМ з чарговай выдатнай ініцыятывай, — зазначыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Сёння мы адкрываем новую старонку гісторыі не толькі маладзёжнага руху, але і інфармацыйнай прасторы. Таму што асвятленне розных думак, поглядаў у перыяды, калі ў краіне адбываюцца найважнейшыя грамадска-палітычныя кампаніі, — менавіта яе задача. Вельмі важна чуць голас маладых людзей, якія з'яўляюцца равеснікамі суверэннай Беларусі. Сёння без умення адстойваць сваю пазіцыю немагчыма быць паспяховым чалавекам, і для многіх праект стане яшчэ адной магчымасцю заявіць пра сябе.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1. Контейнер металлический (шир. — 2,4 м, высота — 2,4 м, длина — 6 м) стоимостью 1 938 400 белорусских рублей.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО «Адватекс» (УНП 391299530) |
| **Наличие обременений** | Отсутствуют |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, г. Новополоцк, местечко Виторжье |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 17.07.2015 в 11.00<br>г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 318 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома<br>210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34<br>www.vitebskjust.gov.by<br>Судебный исполнитель Ходунькин Сергей Сергеевич, тел./факс (80212) 606990. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 600975 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимость имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома № 3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 16.07.2015 г.**<br>Минимальная величина первого шага — 5 процентов от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.<br>Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by. |

# БУДЗЕ ЦІКАВА І ВЕСЕЛА

**Канцэрты, выставы, спартыўныя спаборніцтвы і, безумоўна, салют — да Дня незалежнасці ў Мінску прымеркавалі больш за 100 святочных мерапрыемстваў**

При гэтым традыцыйнага вайсковага параду і маладзёжнага шэсця не будзе. Гэтыя мерапрыемствы сёлета ўжо адбыліся падчас нядаўняга Дня Перамогі. Нязменным засталося ўскладанне кветак да манумента Перамогі, якое пачнецца заўтра ў 11:00 з удзелам Прэзідэнта. Ну а кульмінацыяй свята стане гала-канцэрт «Мы беларусы — мірныя людзі» каля стэлы «Мінск — горад-герой». **Ірына ДРЫГА, першы намеснік міністра культуры,** адзначыла, што ў канцэрце будуць удзельнічаць Іна Афанасьева, Алена Ланская, Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры», Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, салісты нашага Вялікага тэатра оперы і балета. Пачатак — у 22:00. Праз 55 хвілін распачнецца акцыя «Праспяваем гімн разам», пасля якой адбудзецца салют і танцавальная праграма для моладзі. «Завесці» публіку паспрабуюць удзельніца сёлетняга Еўрабачання Юзары, гурты Las Vegas, BY CITY, Navi і іншыя выканаўцы.

Разам з пералічанымі ў Мінску пройдзе яшчэ звыш 100 мерапрыемстваў. У раёнах горада ўжо праходзяць акцыі, звязаныя з увекавечаннем памяці ўдзельнікаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. А непасрэдна 3 ліпеня асноўнай пляцоўкай святкавання стане раён Палаца спорту. **Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ, начальнік аддзела ўстаноў культуры і культурна-асветніцкай працы Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры па справах моладзі Мінгарвыканкама,** паведаміў, што канцэрт тут пачнецца ў 13:00.

Што тычыцца салюту, які пачнецца з апошнімі акордамі дзяржаўнага гімна, ён расцягнецца на 10 хвілін, пройдзе ва ўсіх абласных цэнтрах, а ў Мінску прагучыць з 6 агнявых пазіцый: парк Перамогі, раён Навінак, аэрапорт «Мінск-1», ваенны гарадок Уручча, пустка непадалёк ад Чыжоўскіх могілак, каля вадасховішча Дразды.

— Найбольш прыгожы і эфектны салют будзе ў раёне парку Перамогі, — гаворыць **Анатоль ГРЫЦАЎ, ваенны камендант ваеннай камендатуры Узброеных сіл.** — Абумоўлена гэта тым, што там задзейнічаюць 3 салютныя ўстаноўкі.

Спадар Анатоль просіць тых, хто будзе прысутнічаць на мерапрыемстве, уважліва слухаць супрацоўнікаў міліцыі і вайскоўцаў, дзеля асабістай бяспекі не перасякаць забароненыя зоны.

— Не трэба імкнуцца ўбачыць феерверк зблізу. Найбольш аптымальная адлегласць, з якой можна будзе ўбачыць усю карціну адначасова, — не бліжэй да 600 метраў ад машыны, што працуе на агнявой пазіцыі. Інакш вы проста не пабачыце ўсю маляўнічасць.

Акрамя таго, на цэнтральных святочных пляцоўках будуць усталяваны рамкі для агляду. Напрыклад, ля стэлы — 124 пункты пропуску, асобныя — для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, ветэранаў і бацькоў з маленькімі дзецьмі. Інфармацыя аб іх будзе размешчана на асобных шыльдах, папярэджвае **Дзмітрый КУР'ЯН, начальнік упраўлення аховы правапарадку Галоўнага ўпраўлення правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў.** На святочныя пляцоўкі людзей будуць прапускаць за дзве гадзіны да пачатку мерапрыемстваў. Праход з роварамі і хатнімі гадаванцамі забаронены.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

## ■ Сацыяльны вектар

# ДОМ КЛОПАТУ

## Гісторыя адной бальніцы, якая стане выратаваннем для 80 сем'яў

**Сёння ў Мінску адкрываецца Дом сястрынскага догляду. Адзіны ў сталіцы. Будынак 1930-х гадоў ва ўтульным скверыку на Чырвонаармейскай, непадалёк ад 3-й гарадской клінічнай бальніцы імя Клумава,ператварылі ў сучасную медыцынскую установу, разлічаную на 80 месцаў. Для амаль двухмільённага горада гэта, вядома, не шмат. Аднак для тых 80 сем'яў, што змогуць шпіталізаваць сваіх нямоглых родзічаў, такая дапамога будзе вельмі адчувальнай.**

А два гады таму сітуацыя была зусім іншая. У 2013 годзе Генеральная пракуратура праводзіла чарговую праверку: адсочвала, як выконваецца Дзяржаўная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця. Згодна з гэтым дакументам, у кожным рэгіёне павінна дзейнічаць бальніца сястрынскага догляду. Не абавязкова самастойная ўстанова: догляд хворых старых можа ажыццяўляцца і ў асобным аддзяленні. На той момант у сталіцы такое аддзяленне было толькі ў 11-й бальніцы. Колькасць ложкаў — дзесяць. Трапіць у шэраг тых, каму нарэшце ўдалося «выбіць» месца, зразумела, было нерэальна. Дый кошт, як высветлілася падчас праверкі, не адпавядаў патрабаванням урада. Замест дазволеных 80 працэнтаў ад пенсіі са старых бралі па шэсць мільёнаў за месяц, без уліку медыкаментаў. Сярэдняя пенсія тады складала каля 1,9 мільёна, сярэднестатыстычны заробак — 4,5 мільёна. Пра даступнасць падобнай сацыяльнай дапамогі і казаць няма чаго: разлічваць на яе маглі адзінкі.

Альтэрнатыва, праўда, была. Для звычайнага гараджаніна такая ж нерэальная, як і месца ў аддзяленні на дзесяць ложкаў. Людзі стараліся размясціць сваіх старых бацькоў у аддзяленнях і бальніцах сястрынскага догляду Мінскага раёна. Але ж і там ложкаў дэфіцыт.

Пасля праверкі кошты ў сталічным аддзяленні вярнуліся на свае месцы. Аднак у Генеральнай пракуратуры на гэтым не спыніліся: у маі 2013 года звярнуліся ў Мінгарвыканкам і патрабавалі праанлізаваць патрэбу ў колькасці ложка-месцаў сястрынскага



Фота Надзеі БУЖАН.

догляду для насельніцтва сталіцы і вызначыць тэрміны, калі будзе адкрыта спецыяльная бальніца. Дарэчы, на месцы, дзе цяпер стаіць клініка, збіраліся будаваць бізнес-цэнтр. Выбраная пляцоўка для гандлёва-забаўляльнага комплексу падыходзіла ідэальна: цэнтр горада, жывапіснае наваколле. Інвестару ўрэшце прыйшлося адмовіць. Дзякуючы ўзаемадзеянню кіраўніцтва Міністэрства аховы здароўя, Мінгарвыканкама і Генеральнай пракуратуры, пачалося будаўніцтва сацыяльна значнага аб'екта.

— Важна, каб насельніцтва ўспрымала нас не толькі як карную сістэму, але і арганізацыю, якая валодае моцным праваахоўным патэнцыялам, забяспечвае захаванне правоў і свабод людзей, — адзначаюць у Генеральнай пракуратуры.

Бальніца на Чырвонаармейскай ужо гатовая прыняць першых пастаяльцаў. 2 ліпеня запрацуе першы пост, на 12 ложкаў. Шпіталізаваць сюды будуць пацыентаў, што маюць патрэбу ў пастаянным сацыяльным і медыцынскім доглядзе. **Загадчыца аддзялення Святлана ФАДЗЕЕВА** праводзіць экскурсію па новай клініцы. Акуратныя прасторныя памяшканні (сем палат, дарэчы, аднамесныя), сучасныя функцыянальныя ложкі, вышыню і становішча якіх можна рэгуляваць з дапамогай пульта, прыбіральня з кнопкай экстраннага выкліку (хворым старым неадкладная дапамога можа спатрэбіцца ў любую хвіліну). Вакол будынка — невялічкі цяністы сквер, дзе ў хуткім часе з'явяцца лаўкі для адпачынку.

У Беларусі, дзе кожны пяты — старэйшы за 60 гадоў, патрэба ў падобных бальніцах становіцца ўсё больш адчувальнай. Аддаць нямоглага родзіча ў клініку — не значыць скінуць яго на баланс дзяржавы. Гэта зварот па дапамогу, аказаць якую могуць толькі спецыялісты. Форма клопату, для грамадства пакуль нязвыклая, але часам, на жаль, адзіна правільная.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## ■ Святочнае

# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ, як і дзень нараджэння, ЦЯЖКА ЎЯВІЦЬ БЕЗ ПАДАРУНКАЎ

**3 ліпеня беларусы штогод чакаюць з нецярпеннем. Яшчэ і таму, што ведаюць: да свята незалежнасці ім (і гэта ўжо стала добрай традыцыяй) падрыхтавалі прыемныя сюрпрызы — у выглядзе новых сацыяльна значных аб'ектаў. Гэты год — не выключэнне. Што гэта за аб'екты, даведаліся карэспандэнты «Звязды».**

### АЛЕЯ СЛАВЫ ГЕРОЯЎ-ЗЕМЛЯКОЎ

**У цэнтры Лёзна 3 ліпеня ў гонар Дня Незалежнасці адкрыюць Алею Славы.**

— На 21 стэлах можна будзе ўбачыць імёны і партрэты землякоў, якія па-геройску ваявалі, працавалі так добра, што з іх бралі прыклад. Сярод самых дастойных ураджэнцаў Лёзненшчыны — 5 Герояў Савецкага Саюза, 3 поўныя кавалеры ордэна Славы, 11 Герояў Сацыялістычнай Працы, — паведамілі «Звяздзе» ў Лёзненскім райвыканкаме. Дзякуючы намаганням гэтых людзей, наша краіна адстаяла сваю незалежнасць і дабілася вялікіх поспехаў у развіцці.

— Грошы на стварэнне алеі зарабілі падчас двух суботнікаў. І на абласным узроўні ўлады аказалі дапамогу, унёсак зрабілі і працоўныя калектывы... На гэтым знакавым не толькі для раёна аб'екце працуюць рабочыя мясцовай арганізацыі ЖКГ, — паведаміла журналістам **старшыня Лёзненскага райсавета дэпутатаў Тамара ДРЫЛЁНАК.**

Алея Славы такім чынам стала «народнай будоўляй». Да свята абновяць і раённую Дошку гонару.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

### СІНТЭТЫЧНЫ ГАЗОН І ВЕЛАТРЭК НА СТАДЫЁНЕ

**У Мінску адкрыўся абноўлены стадыён сярэдняй школы №55, што месціцца ў Ленінскім раёне горада. І хоць да пачатку ўрокаў фізкультуры на ім застаецца яшчэ амаль два месяцы, апрабаваць новую спартыўную пляцоўку зможа кожны аматар здаровага ладу жыцця.**

— Дзяржава надае асаблівую ўвагу развіццю фізкультурна-аздараўленчых устаноў у краіне, — сказаў **памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Мінску Аляксандр ЯКАБСОН** падчас цырымоніі адкрыцця. — Шмат спартыўных аб'ектаў было ўзведзена да чэмпіянату свету па хакеі, які праходзіў летась у Мінску. Але ў нас рэгулярна адкрываюцца не толькі вялікія аб'екты, але і маленькія, кшталту гэтага стадыёна.

Абноўленае збудаванне па сутнасці з'яўляецца комплексам пляцовак для заняткаў рознымі відамі спорту. На ім ёсць футбольнае поле з сінтэтычным газонным пакрыццём, тэнісны корт, пляцоўка для заняткаў баскетболам і валейболам, велатрэк, гімнастычны гарадок і пляцоўка для заняткаў воркаўтам. І, як тое стала правілам для новых школьных стадыёнаў, там з'явяцца трыбуны для гледачоў, з якіх яны будуць назіраць за спаборніцтвамі і трэніроўкамі. Месца ёсць — было б жаданне!

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

### УТУЛЬНА БУДЗЕ ПАЦЫЕНТАМ

**У Гомельскім абласным клінічным кардыялагічным цэнтры пасля рэканструкцыі адкрылася аддзяленне сасудзістай хірургіі.**

Тут на працягу года атрымлівае лячэнне каля 1500 пацыентаў, палова з якіх — з раёнаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Штогод у адзіным на Гомельшчыне аддзяленні выконваецца больш за тысячу аперацый на сасудах, аорце і сонных артэрыях, высокатэхналагічных умяшанні з устаноўкай стэнтаў. Кругласутачна аказваецца высокакваліфікаваная дапамога ўсім аддаленых раёнах па лініі санавіяцыі. Рэканструкцыя аддзялення стала магчымай за кошт сродкаў, якія накіроўваюцца на ліквідацыю наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Фінансаванне па чарнобыльскай праграме склала Br6,5 млрд. Сродкі былі выкарыстаны для абсталявання перавязачных і працэдурных кабінетаў, рамонту палат — у тым ліку для інвалідаў і ўдзельнікаў вайны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

### НЯСВІЖ АБЗАВЯДЗЕЦЦА СУЧАСНАЙ АЎТАСТАНЦЫЯЙ

**Маштабная рэканструкцыя пасажырскіх тэрміналаў пачалася ў Мінскай вобласці восем гадоў таму. Усяго абнавіліся 14 транспартных тэрміналаў прыстадічнага рэгіёна. І вось цяпер чарга дайшла да Нясвіжа, дзе рэканструкцыя мясцовай аўтастанцыі працягвалася два гады. Новы будынак яе адчыніць свае дзверы ўжо заўтра.**

— Распрацоўшчыкі праекта аўтастанцыі ўлічылі архітэктурна-планіровачныя рашэнні, каб не парушыць ансамбль горада і не папсаваць яго гістарычную каштоўнасць, — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Мінскім абласным выканаўчым камітэце. — Да ранейшага памяшкання дабудавалі двухпавярховы корпус. Цяпер на аўтастанцыі будзе ўсё неабходнае для пасажыраў і супрацоўнікаў: зала чакання, дыспетчарская, пакоі адпачынку для кіроўцаў і кантралёраў, пакой маці і дзіцяці, грамадская прыбіральня, аптэка, кавярня і крама нехарчовых тавараў. Што да вонкавага выгляду, то новы пасажырскі тэрмінал стане візітоўкай горада для турыстаў з Беларусі і краін замежжа.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## ■ Фестываль

# СЯБРЫ, ЗБІРАЙЦЕСЯ Ў АЛЕКСАНДРЫІ!

**Перад Купаллем, што выпадае на панядзелак-аўторак, варта паехаць у Шклоўскі раён. 4 і 5 ліпеня ў аграгарадку Александрыя на беразе Дняпра, у атачэнні шыкоўных краявідаў будзе праходзіць свята «Александрыя збірае сяброў».**

На ім адбудуцца ўсе магчымыя выставы (нешта на іх можна будзе і набыць), тут знойдуцца сувеніры, кнігі і харчаванне, прадукцыя перапрацоўчай прамысловасці, вырабы народных майстроў. Будзе прадстаўлена экспазіцыя «Археалагічныя знаходкі Верхняга Падняпроўя», выстава племяннай жывёлагадоўлі і іншыя. Дарэчы, па традыцыйных відах рамёстваў пройдуць майстар-класы.

Паміж выстаўкамі і пунктамі продажу можна будзе падсілкавацца, прычым нядрэнна — на свяце будзе працаваць больш за шэсцьдзясят суб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. Можна трапіць на «Свята сала», «Свята мёду» ці ў «Гасцёўню Бульбаша». Галоўная сцэнічная пляцоўка на другі дзень стане месцам, дзе ўзнагародзяць перадавікоў аграпрамысловага комплексу Магілёўскай вобласці за 2014 год.

«Асноўны ўхіл у канцэпцыі свята сёлета, апроч традыцыйных стылёвых элементаў, рабіўся на моладзь, усё ж такі Год моладзі, — расказала нам **намеснік начальніка аддзела мастацтваў і культпрасветработы Магілёўскага аблвыканкама Ірына ЖАРКОЎСКАЯ.** — Таму адразу пасля адкрыцця на малой канцэртнай пляцоўцы пачнецца святочная праграма «Моладзь.Традыцыі. Будучыня», дзе будуць і студыі мадэлінгу, і тэатр мод, і КВЗ, і дэманстрацыя спартыўных дасягненняў. Будуць прадстаўлены гледачам гала-канцэрт маладзёжнага эстраднага конкурсу «Лесвіца ў неба», што праходзіў у вобласці, канцэрт «Купальскія мелодыі Александрыі» з абрадавымі элементамі. Упершыню ў праграму ўключаны творчы праект «Купальская мазаіка» — гэта пяць выставачных экспазіцый, дзе маладыя майстры правядуць майстар-класы і пакажуць працэс вырабу тканага пояса. Потым гэты пояс будзе перададзены ў Магілёўскі краязнаўчы музей імя Раманава. Адным з асноўных мерапрыемстваў стане паказ на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы мюзікла «Папараць-кветка» з удзелам «зорак» беларускай і расійскай эстрады».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

# 25 КРОКАЎ НА ШЛЯХУ

**Заўтра ў краіны самае вялікае, галоўнае свята — Дзень Незалежнасці. Мы адзначаем яго ў гадавіну вызвалення Беларусі ад фашыстаў, і ў гэтым — і найвялікшы сэнс, і простая ісціна. Бо, калі б не было ў біяграфіі нашай Радзімы 3 ліпеня 1944 года, не было б увогуле нічога — ні Радзімы, ні нас. Ні найноўшай гісторыі краіны Беларусь, якую самі ствараем, сведкамі якой з'яўляемся. Не было б іншага ліпеня — 1990 года, калі Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце. З таго часу ўжо мінула 25 гадоў, Беларусь як суверэнная незалежная дзяржава заявіла пра сябе ў свеце на поўны голас. Мы шмат дасягнулі, нам сапраўды ёсць чым ганарыцца. «Звязда» прапануе кароткі экскурс у жыццё нашай краіны апошніх дзесяцігоддзяў. Гэтыя значныя крокі мы зрабілі разам. А колькі яшчэ наперадзе!**



**1.** У чэрвені — ліпені 1994-га прайшлі першыя прэзідэнцкія выбары. У другім туры перамог Аляксандр Лукашэнка, які ў перадвыбарчай праграме зрабіў акцэнт на зніжэнне інфляцыі, спыненне працэсу збяднення краіны і народа, барацьбе з карупцыяй, аднаўленне сувязяў з краінамі былога Савецкага Саюза.



**2.** 15 сакавіка 1994 года прыняты асноўны закон дзяржавы — Канстытуцыя. Краіна аб'яўлена ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай. Праз год у выніку рэферэндуму зацверджаны сучасныя сцяг і герб краіны. Пасля рэферэндуму 1996 года сёння шняю назву і структуру атрымаў і заканадаўчы орган нашай краіны. Ранейшы Вярхоўны Савет, што складаўся з 260 дэпутатаў, быў рэструктураваны ў двухпалатны Нацыянальны сход.

**3.** У чэрвені 1993-га Беларусь афіцыйна далучылася да Дагавора аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі, а ў 1996—1997 гадах завяршыўся вывад яе з тэрыторыі краіны. Трэба падкрэсліць, што Беларусь адмовілася ад валодання самым сучасным ваенным ядзерным патэнцыялам без усялякіх папярэдніх умоў. Гэтым мы фактычна паклалі пачатак працэсу ўрэгулявання пытанняў ядзернага раззбраення на постсавецкай прасторы ў інтарэсах міжнароднага міру і бяспекі.

**4.** Як вядома, наша дзяржава яшчэ ў 1945-м стала адной з краін — заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Атрымаўшы незалежнасць, Беларусь пачала прымаць яшчэ больш актыўны ўдзел у міжнародных ініцыятывах. Так, у 2000 годзе на 55-й сесіі Генасамблеі ААН па ініцыятыве нашай краіны прынята рэзалюцыя «Меры, якія павінны быць прыняты супраць расізму, палітычных платформаў і дзейнасці, заснаваных на дактрынах перавагі, у аснове якіх ляжаць расавая дыскрымінацыя або этнічная выключнасць і ксенафобія, уключаючы, у прыватнасці, неанацызм». Наша дзяржава — ініцыятар ідэі аб актывізацыі міжнароднай барацьбы з гандлем людзьмі. На 61-й, 63-й і 64-й сесіях Генеральнай Асамблеі ААН па ініцыятыве Беларусі былі прынятыя тры комплексныя рэзалюцыі супраць гэтых злачынстваў.

**5.** Створана Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі — самы паспяховы інтэграцыйны праект на постсавецкай прасторы, які накіраваны на арганізацыю агульнай палітычнай, эканамічнай, ваеннай, мытнай, валютнай, юрыдычнай, гуманітарнай, культурнай прасторы. Як працяг інтэграцыйнай палітыкі нашай краіны, накіраванай на паляпшэнне дабрабыту і пашырэнне магчымасцяў грамадзян, — далучэнне да Мытнага саюза і Еўразійскага эканамічнага саюза.

**6.** Рэалізавана праграма «Адраджэнне вёскі». Першапачаткова былі вызначаны два галоўныя напрамкі дзейнасці: першы, звязаны з сацыяльна-эканамічным развіццём галіны, і другі, прызначаны палепшыць якасць жыцця людзей. За перыяд з 2005 па 2010 год быў пабудаваны 1481 аграгарадок. У кожным населеным пункце падобнага тыпу прадугледжваецца забеспячэнне людзей халоднай і гарачай вадой, цэнтральнае газазабеспячэнне, вуліцы з цвёрдым дарожным пакрыццём, транспартная сувязь з раённым і абласным цэнтрамі, амбулаторыя, філіял раённай ЖКГ.



**7.** У 2014-м быў атрыманы рэкордны ўраджай — больш за 10 мільёнаў тон збожжа. Гэта поспех не толькі айчынных хлебаробаў, але і навукоўцаў-селекцыянераў.

**8.** Мадэрнізацыя айчынных прадпрыемстваў, як вынік — рост якасці беларускай прадукцыі. У адрозненне ад краін Балтыі, у нейкай ступені Расіі, мы практычна не страцілі ні аднаго буйнога прадпрыемства, а, наадварот, аднавілі іх і захавалі рынкі збыту. Гэта дазволіла зберагчы працоўныя месцы, выканаць шмат сацыяльных праграм.

**9.** Паспяховая рэалізацыя праграм па дэмаграфічнай бяспецы, у выніку чаго ў некаторых рэгіёнах краіны нараджальнасць ужо перавысіла смяротнасць. Значна павялічылася падтрымка маладых, а таксама шматдзетных сем'яў. З гэтага года ўведзены мацярынскі капітал.

**10.** Дзяржава асаблівую ўвагу надае клопату пра дзяцей-сірот, прафілактыцы сацыяльнага сіроцтва: з кожным годам усё больш сем'яў у нашай краіне прымае рашэнне ўзяць прыёмнае дзіця. Сёлета завяршаецца чацвёртая прэзідэнцкая праграма «Дзеці Беларусі», якая, акрамя іншага, мае на мэце забяспечыць эфектыўную сацыялізацыю дзяцей, што аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Статыстыка за 2005 год паказвала: у краіне — амаль 12 тысяч сірот, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах, а звесткі за мінулы год сведчаць, што дзяцей, якія жывуць у інтэрнатах, менш за 5 тысяч.

**11.** Гарантуецца роўнасць усіх грамадзян у атрыманні адукацыі, адзінства адукацыйных сістэм і пераемнасць усіх формаў навучання. Па інфармацыі Белстата, узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва ў Беларусі, як і ў развітых краінах свету, набліжаецца да 100% і складае 99,6%. Краіна — адна з лідараў у рэгіёне па колькасці людзей з вышэйшай адукацыяй. У нас суадносіны колькасці студэнтаў да колькасці насельніцтва ў адпаведным узросце складаюць 91,5%. Апераджаюць нашу дзяржаву ў гэтым рэйтынгу толькі Рэспубліка Карэя — 98,4%, ЗША — 94,3% і Фінляндыя — 93,7%.

**12.** Сучасная Беларусь займае дастойнае месца ў сусветнай спартыўнай супольнасці. У рэспубліцы культывіруецца 132 віды спорту. Краіна з 10-мільённым насельніцтвам у перыяд суверэнітэту рэгулярна ўваходзіць у лік дваццаці наймацнейшых сярод больш як 200 спартыўных дзяржаў свету, якія прымаюць удзел у Алімпійскіх гульнях.

**13.** Свой аўтарытэт спартыўнай дзяржавы наша краіна ўмацавала, стаўшы краінай — арганізатарам чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе, а таксама чэмпіянату свету па біятлоне сярод юнакоў і юніёраў сёлета.

**14.** За апошнія гады праведзена поўная мадэрнізацыя ўсіх звёнаў сістэмы аховы здароўя — ад фельчарска-акушэрскіх пунктаў да абласных бальніц і сучасных медыцынскіх цэнтраў. Па інтэгральным паказчыку дзіцячай і мацярынскай смяротнасці Беларусь займае 4-е месца ў свеце, сярод дзяржаў СНД лідзіруе па тэмпах зніжэння распаўсюджанасці ВІЧ/СНІД і працэнце ахопу антырэтравіруснай тэрапіяй. Захваральнасць на туберкулёз у Беларусі зніжаецца хутчэй, чым у Фінляндыі, Швейцарыі, Аўстрыі і Нарвегіі. Наша краіна займае адно з вядучых месцаў у свеце па доступе насельніцтва да медыцынскіх паслуг (дзеліць 1-е месца ў свеце з Брунеем і Канадай). А па даступнасці паслуг па ахове рэпрадуктыўнага здароўя знаходзіцца на ўзроўні такіх краін, як Францыя, Фінляндыя, Люксембург, і ўваходзіць у 50 найлепшых краін свету па вядзенні цяжарнасці, арганізацыі родаў кваліфікаваным медыцынскім персаналам.

**15.** Беларускія хірургі першымі ў свеце сталі апераваць пацыентаў з дэнервацыяй прэпіларычнага аддзела страўніка (парушэннем эвакуацыі ежы са страўніка) пры дапамозе ўнікальнай лапараскапічнай методыкі, якая дазваляе захаваць і аднавіць функцыі страўніка. У 2012 годзе аперацыі былі ўдала выкананы дзвюм пацыенткам. Ва ўсім свеце такія аперацыі пакуль праводзяць адкрытым спосабам, пасля чаго чалавек застаецца інвалідам.





Марына ГРЫЦУК:

# «Я ўвесь час смяюся да слёз!»

**Гледачам тэлеканала АНТ яна добра вядома па праектах «Фактар смеху», «Сярэбраны грамафон», «Наша раніца» і «Бацькоў у школу». Але многія і сёння асацыююць яе імя з КВЗ, дзе Марына Грыцук была моцным гульцом і заваявала не адзін тытул. А вось яна лічыць сваім галоўным дасягненнем трох сыноў.**

**Мы вырашылі сустрэцца з вядомай тэлевядучай і даведацца, дзе шукаць якасныя жарты, у якіх праектах яна рэалізуецца цяпер і чаму яе навучыла праца на тэлебачанні.**

***— Аднойчы на пытанне, што галоўнае ў жыцці, вы адказалі: «Гэта я». Такі здаровы эгаізм заўсёды быў, ці ён з'явіўся з цягам часу?***

— Вядома, я прыйшла да такой высновы паступова, калі выйшла замуж, нарадзіла траіх дзяцей. Не змогу зрабіць шчаслівымі іншых тых, хто сам няшчасны. А жанчынам вельмі ўласціва ахвяраваць сабой дзеля іншых. У нас матулі часта забываюцца пра сябе, свой знешні выгляд, ужо не гаворачы пра час для сустрэч з сяброўкамі. Я таксама была такой і, змагаючыся з рознымі дэпрэсіўнымі настроямі, зразумела, што насамрэч варта быць у большай ступені эгаістычнай, чым я ёсць.

***— Улічваючы, як прыгожа вы выглядаеце, знаходзіць час для сябе — важна...***

— Я проста ў грыме *(смяецца)*. Наогул, не вельмі люблю гаварыць пра тое, як я выглядаю, і сваю фігуру не лічу ідэальнай. Сустракаючы жанчыну за 35 з дзецьмі, ды яшчэ і з добрай фігурай, варта разумець, якіх высілкаў гэта патрабуе.

***— Многія адзначаюць, што з нараджэннем дзяцей людзі мяняюцца.***

— У кожнага ўсё адбываецца па-свойму. Мне здавалася, што нараджэнне першага дзіцяці на мяне неяк асабліва паўплывала, аднак і з'яўленне другога і трэцяга сыноў таксама змяніла мяне. Многае залежыць і ад дзіцяці. Уявіце толькі, што ў доме з'яўляецца новы чалавечак і ты думаеш: «Як я магла жыць без яго?» Зразумела, застаецца менш часу, пабытавых клопатаў становіцца больш, але разам з тым дабаўляецца любові і шчасця ў сям'і...

Калі мы кажам пра тое, што жанчына з нараджэннем дзіцяці робіцца мудрэйшай і больш цярплівай, то тут у пэўнай ступені многае залежыць ад самой маці і ад таго, што адбываецца навокал у яе жыцці. У навінах перыядычна паказваюць, як часам матулям не хапае гэтага цярпення і яны робяць жудасныя рэчы. Аднак давайце не забывацца, што цярпенне з'явіцца толькі там, дзе ёсць месца адпачынку. Калі ж прыходзіш з працы, табе трэба стаяць ля пліты, вучыць урокі, мыць бялізну: такі распарадак штодня, то і сарвацца нядоўга. Трэба памятаць, што нічога не з'явіцца проста так. Тое ж цярпенне трэба ў сабе выхоўваць. І кожнае дзіця нам дадзена, каб зрабіць нас лепшымі.

**У мяне было кляймо «дзяўчына з каманды вясёлых і знаходлівых», якая забаўляе людзей. Рада, што змагла папрацаваць у больш сур'ёзным праекце.**

***— Праект «Бацькоў у школу», як вы адзначалі, не мае мэты вучыць некага, а толькі паказвае сітуацыю, дае гледачам магчымасць паглядзець на выхаванне збоку. Працуючы ў праграме, лавілі сябе на думцы, што і вам ёсць над чым задумацца?***

— Такое здаралася шмат разоў. Ведаеце, ёсць выслоўе, быццам рыхтаваць з дзіцем хатняе заданне амаль тое ж, што клеіць з мужам шпалеры. І калі мы кажам сыну ці дачцэ «тут усё проста, ну, як ты не разумееш элементарныя рэчы», то гэтым гаворым сваму дзіцяці, што яно не разумнае. Варта шукаць іншыя словы, якія змогуць стаць стымулам, а не зробяць дзіця замкнёным. Пра гэта кажуць і самі дзеці. Адна дзяўчынка расказала, што маці яе любіць менш, чым малодшага брата, таму што, калі той зайшоў у пакой, яму яна ўсміхнулася, а ёй не. Дзеці часта заўважаюць такія «дробязі», якія прапускаем мы, бацькі... Часам стрымліваю сябе, бо разумею, што нас так выхоўвалі і мы імкнёмся тую ж мадэль выхавання перанесці ў сваю сям'ю.



На праекце «Бацькоў у школу».



Амплуа «дзяўчыны з КВЗ» і сёння яе не адпускае.

***— Працяг праекта будзе?***

— Летам у нас пакуль зацішша. А з надыходам новага сезона будзе разгледжана і гэтае пытанне. Варта разумець, што праграма ліцэнзійная і патрабуе немалых грошай, каб з'явіліся новыя серыі. Тут не спрагназуеш.

***— Менавіта за гэты праект вас адзначылі як «Найлепшую вядучую тэматычнай праграмы». Якімі былі пачуцці?***

— Мне было вельмі прыемна, што маю працу ацанілі. За сваю больш чым дзесяцігадовую кар'еру на тэлебачанні я вяла розныя праекты. Але ў праграму «Бацькоў у школу» ўкладзены не толькі час, але і душа, думкі. Часам у працы здараліся няпростыя моманты. Прыемна ведаць, што, дзякуючы нашай праграме, у некаторых сем'ях бацькі і дзеці змаглі зрабіць крок насустрач адно аднаму, пачуць, зразумець. Калі праект забаўляльны, то вынік адзін, а, назіраючы, як рэальна твая праца дапамагае людзям (калі да тых жа парад за кадрам прыслухоўваліся), маем адчуванні зусім іншыя.

***— Эмацыянальна наколькі складана працаваць у такой праграме?***

— Спачатку было складана, а потым з'явіўся элемент прывыкання, і ты да ўсяго адносішся як да працы. Слухаючы кранальныя гісторыі дзетак, бачачы іх слёзы, некалькі дзён ад усяго адыходзіш, але разумееш, што самае важнае — дапамагчы рэальна. Шмат жыццёвых гісторый прайшло праз нас у праграме. Спярша было жаданне з кожным падтрымліваць сувязь, цікавіцца, якія перамены ў сям'і адбываюцца... Цяпер, калі дзяцей стала больш за дзве сотні, проста спадзяешся, што ўсё будзе добра і ў нашых дамах часцей стане гучаць дзіцячы смех.

***— Раней у вас былі іншыя праекты, розныя — па жанры і па змесце. «Бацькоў у школу» — сведчанне прафесійнага росту?***

— У мяне было кляймо «дзяўчына з каманды вясёлых і знаходлівых», якая забаўляе людзей. Рада, што змагла папрацаваць у больш сур'ёзным праекце. Зараз працягваю ісці ў гэтым жа кірунку. Нядаўна стала вядучай беларускай версіі праграмы «Чакай мяне». Мне падабаецца, што тэлебачанне дае магчымасць гаварыць вялікай аўдыторыі пра сапраўды важнае.

**Трэба памятаць, што нічога не з'явіцца проста так. Тое ж цярпенне трэба ў сабе выхоўваць. І кожнае дзіця нам дадзена, каб зрабіць нас лепшымі.**

***— За 11 гадоў працы на тэлебачанні чаму вас навучыла прафесія?***

— Яна дала мне ўпэўненасць у маіх сілах. Навучыла разумець і памятаць, што кожны чалавек, які пераступае парог студыі, унікальны. Не бывае нецікавых людзей, калі вы здольныя перамагчы іх закрытасць. Мая задача — паказаць свайго героя гледачам. Калі мне ўдаецца знайсці падыход да чалавека і я бачу, як ён сам імкнецца гаварыць, гэта дарагога каштуе.

***— Вы не адзін год гулялі ў КВЗ. Ці адсочваеце сёння, як там жартуюць? Дзе наогул у наш час шукаць якасны гумар?***

— Складанае пытанне, таму што паставіць знак якасці жарту, улічваючы, што кожны ўспрымае яго па-рознаму, складана. Адным падабаецца гумар, дзе трэба падумаць, іншым дастаткова гумару «ніжэй пояса». Як вынік, якасны гумар... не вызначыць. Я працягваю глядзець гульні КВЗ, але цяпер больш цікаўлюся інтэлектуальнымі перадачамі, дзе трэба шукаць адказы на пытанні.

***— У вашым жыцці бывае смех скрозь слёзы?***

— Я ўвесь час смяюся да слёз. Але здараюцца сітуацыі, у якіх вельмі складана ўсміхацца. Часам непакоішся праз дробязь, а варта азірнуцца і ўбачыць, як складваецца жыццё ў іншых, каб зразумець: у цябе яшчэ не ўсё дрэнна!

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

■ На хвалі

# СВЯТКУЕМ РАЗАМ!

Мінская Волна радио

**У суботу, 4 ліпеня, мінчан і гасцей сталіцы будзе чакаць падарунак ад радыёстанцыі «Минская волна». З нагоды святкавання Дня Незалежнасці каля Камароўскага рынку адбудзецца святочны канцэрт, арганізаваны адміністрацыяй Савецкага раёна сталіцы пры інфармацыйнай падтрымцы «Выдавецкага дома «Звязда».**

Усіх прысутных чакаюць не толькі выступленні найлепшых творчых калектываў Мінскай вобласці, але і конкурсы з прыемнымі падарункамі. У святочнай праграме заяўлены ансамбль народнай песні «Каханачка» (БНТУ), арт-фольк-дуэт «Велес», вакальны гурт «Белая Русь» прадпрыемства «Світанак» (г. Жодзіна), спявак, лідар гурта «Эківокі» Аляксандр Сухараў, яркі сямейны дуэт Руслана Свірыдава і Юліі Навамір (уладальнікі Гран-пры тэлевізійнага фестывалю-конкурсу армейскай песні «Звязда»), спявачка Наталля Навумовіч, а таксама музычная студыя «7-я», выступленні Наталлі Зайцавай і Таццяны Атрошанкі.

Радыё «Минская волна» — лідар FM-вяшчання ў цэнтральным рэгіёне краіны, які спецыялізуецца на інфармацыйнай, культурна-асветніцкай і музычнай тэматыцы. Вяшчае кругласутачна на тэрыторыі Мінска і Мінскай вобласці. Ад свайго эфірнага сэрца, ад імя раённых выканаўчых камітэтаў Мінскай вобласці і вядучых прадпрыемстваў сталічнага рэгіёна віншуе жыхароў і гасцей сталіцы з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь! І запрашае на святочны канцэрт, які пройдзе каля Камароўскага рынку з 12.00 да 15.00 у суботу, 4 ліпеня. Такое мерапрыемства ў Мінску праходзіць упершыню, але, можа, якраз гэтая сустрэча стане пачаткам добрай традыцыі збірацца разам. ■

# АЎТОРАК, 7 ЛІПЕНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.35 Зона Х.
8.50 Слова Мітрапаліта Паўла на Каляды Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Іаана.
9.10, 22.00 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Кахане — не бульба».
12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».
13.05 Серыял «Дзявочае паляванне».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.40 Дэтэктыў «Логава Змея». 1-я серыя.
17.40 Серыял «Давай пацалуемся!».
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.40 «Прэзідэнцкі спартыўны клуб: «10 гадоў. Перамагаем разам!». Дак. фільм.
22.00 Серыял «След».
0.25 Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.45 Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой».
10.10 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
10.35 Фільм — дзецям «Госця з будучыні».
11.50, 21.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
12.40, 22.40 Серыял «Косці».
13.35, 19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
15.20 «Хачу ў тэлевізар». Рэаліці-шоу.
15.55 «Comedy woman».
17.55, 1.00 Серыял «Атэль «Вавілон».
21.00 Мазгавы штурм.
21.35 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
23.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

23.55 Серыял «Быць чалавекам».

## БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабранранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 13.00, 18.40, 1.20 Калейдаскоп.
8.10, 13.10, 18.55, 1.30 «Размовы пра духоўнае».
8.20 Творчы вечар народнага артыста Расіі Аляксандра Міхайлава.
9.25 «Мужыкі!». Драма.
10.55 «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Корцік».
11.25, 17.30 «Корцік». Кінаповесць. 1-я серыя.
12.30, 22.40 «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Ізраіля Басава.
13.20 «Капабланка». Драма.
14.50 «Калі зварухнецца душа...» Музычны фільм з удзелам Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча.
15.20 «Купальская ноч». Камедыя.
16.30 М/ф.
19.05 «Тры жанчыны Дастаеўскага». Драма.
20.45 Калыханка.
21.00 «Вечар цяжкага дня» на Славянскім базары.
21.25 «Адалень-трава». Камедыя.
23.10 «Гарыкі і чалавекі». Жыццё і творчасць Ігара Губермана. Фільм першы.

## БЕЛАРУСЬ 5

7.15, 7.45, 0.25 PRO спорт. Навіны.
7.30 Спорт-мікс.
8.05 Час футбола.
8.45 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Другі раўнд. Чарнагорыя — Беларусь.
10.25 Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
12.25 Баскетбол. НБА. Фінал. 1-ы матч. «Голдэн Стэйт» — «Кліўленд».

15.00 Тэніс. Уімблдон.
23.00 Спорт-кадр.
23.30 Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.05, 16.20 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Практыка».
23.05 Серыял «Рані».



0.05 «Мужчынскае/Жаночае».
1.00 «Сам-насам з усімі».
1.50 Начныя навіны.

## СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Камедыя «Час пік».
10.10 «Далёкія сваякі».
10.40 «Салдаты 7». Серыял.
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.45 «Наша справа».
13.55 «Эліксір маладосці».
14.50, 23.20 «Турысты». Серыял.
16.50 «Цэнтральны рэгіён».
17.35 «Званая вячэра».

18.35 «Вайна без правілаў»: «Страчаны свет».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Тэрыторыя памылак».
22.05 «Глядзець усім!».
23.00 «Аўтапанарама».
0.55 «Разумней не прыдумаеш».

## МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 2.50 Маст. фільм «Мая Анфіса».
10.55 Маст. фільм «Залезь на Месяц».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 2.00 Серыял «Прыгажосць без ахвяр».
14.15, 4.15 Серыял «Такое звычайнае жыццё».
16.25, 1.05 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20 Серыял «Ты не адзін».
19.25 Маст. фільм «Адданы сябар».
21.10, 23.15 Серыял «Класныя мужыкі».
0.25 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
0.35 «Дыяспары».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 17.10 «Чыстая перамога. Найвялікшая паветраная бітва ў гісторыі».
12.10 Маст. фільм «Дзённы цягнік».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
18.00 Серыял «Апошні янычар».
18.55 «Асаблівы выпадак».
20.55 «Рассудзяць людзі».
21.55, 23.10 Серыял «Чужое гняздо».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «Кава з малаком».
9.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».

10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
10.20 «Суд прысяжных».
11.25 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
12.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.15 Серыял «Горад спакус».
14.50 «Справа густу».
15.20, 16.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
18.00 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».
21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».
23.25 Серыял «Пятніцкі. Глава другая».

## 8 КАНАЛ

7.00, 14.10, 19.15, 21.05, 23.30 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.15, 19.20 Серыял «Скандал».
8.40 Серыял «Вострыя казыркі».
9.40, 10.50 «Кінаблакнот».
9.50, 12.55, 13.55, 15.45, 16.30, 18.10, 19.00, 21.00 «Хатняя крама».
10.00 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».
11.00 Трылер «Місія невыканальная».
13.00 Серыял «Ключы ад бездані».
14.15 Дак. серыял «Аповеды пра жывёл».
14.45 Серыял «Рабыня Ізаўра».
16.15 «Золата маўчання».
16.40 Серыял «Мёртвая зона».
18.15 Серыял «Каварныя пакаёўкі».
20.50 «Вечарніца».
21.10 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.20 Камедыя «Рыбка па імені «Ванда».
23.10 Серыял «Байкі са склепа».
23.35 «Хобі TV».

## ВТБ

6.00, 5.20 «PLAY».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30, 15.00, 3.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
8.00, 17.30, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00, 18.00, 23.30 Серыял «Васьмідзясятыя».
10.00, 19.00 Скетчком «Сям'я 3 D».
11.00 Меладрама «Выпрабавальны тэрмін».
13.05, 15.30 Серыял «Ералаш».
13.30 Серыял «Дочкі-мацi».
14.30, 3.00 «Летні фрэш».
16.00, 20.00 Серыял «Сваццi 2».
17.00, 5.00 «Лаві момант».
21.10 Камедыя «Таткі 2».
23.05, 4.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.00, 4.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».

## КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 22.50 Навіны культуры.
10.15, 1.00 «Наглядальнік».
11.15 Да юбілею Канстанціна Райкіна. «Не ўсё кату масленіца». Спектакль тэатра «Сатырыкон».
13.05, 17.55, 2.40 «Сусветныя скарбы культуры».
13.20, 0.20 «Партрэт у ружовай сукенцы. Наталля Канчалоўская». Дак. фільм.
14.00 «Правілы жыцця».
14.30 «Правінцыйныя музеі Расіі». Горад Златавуст.
15.10 Пісьменнікі нашага дзяцінства. Святаслаў Сахарноў.
15.40, 1.55 «Паліглот». Вывучым англійскую за 16 гадзін!
16.25 «Аксакавы. Сямейныя хронікі». Дак. серыял. 1-я серыя.
17.10 Кшыштаф Пендэрэцкі. Чатыры стагоддзі інструментальнага канцэрта. Вялікі сімфанічны аркестр імя П.І. Чайкоўскага пад кіраўніцтвам Уладзіміра Федасеева.
18.15 «Аляксандр Таіраў. Камерныя гісторыі Камернага тэатра». Дак. фільм.
19.15 Улада факта. «Вялікія філантропы».
19.55 «Добрай ночы, малыя!».
20.10 «За навуку адказвае Келдыш!» Дак. фільм.
20.50 «Сам-насам з гледачом».
21.15, 23.10 Канстанцін Райкін, Дзяніс Суханаў, Агрыпіна Сцяклова ў спектаклі тэатра «Сатырыкон» «Кароль Лір».
22.40 «Джордж Байран». Дак. фільм.
23.05 Мастсавет.

## НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Акулы пяра». Аляксандр Разенбаум. 1997 год.
6.40, 8.25, 9.15, 15.40, 17.00, 17.35, 18.35, 20.10, 21.40, 23.00, 23.35, 2.10 Музычная настальгія.
7.30 «Усё будзе так, як мы захочам». Фільм-канцэрт аб VI Ленінградскім рок-фестывалі. 1989 год.
9.00 М/с «Болек і Лёлек».
10.00 Маст. фільм «Халодны сакавік».
12.00 The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Сустрэча сяброў» у клубе «Высоцкі». 2007 год.
13.00 Маст. фільм «Споведзь».
14.45 М/ф «Песенька ў лесе».
15.00, 21.00 «Мінулы час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
17.30, 23.30 «Прэс-экспрэс». 1995 год.
18.00 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Тацяна Акунеўская.
19.00 Маст. фільм «Дэпутацкі час».
20.35 М/ф «Восеньская рыбалка».
20.40 М/ф «Мышаня, якое хацела быць падобным на чалавека».
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1967. 2-я частка. Паўтор ад 2008 года.
1.20 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Аляксандр Шырвінд і Міхаіл Дзяржавін.
2.50 М/ф «Дзьмухавец — тоўстыя шчокі».

3.00 «Быў час». 2009 год.
4.00 Маст. фільм «Гу-Га».

## EUROSPORT

3.30 Футбол. Кубак свету. Жанчыны.
4.30, 12.30, 20.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-19).
6.00 Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Фінал.
7.30 Плаванне. Універсіяда.
9.00 Спартыўная гімнастыка. Універсіяда. Фінал.
14.00, 18.45, 23.45 Веласпорт.
15.15, 2.30 Веласпорт. Нацыянальны тур дэ Франс.
19.00, 2.15 WATTS.
20.15 Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
0.45 Аўтагонкі.
1.15 Матакрос. Чэмпіянат свету.
1.45 Чэмпіянат свету ў класе Турынг.

## КАМЕДЫЯ

6.00, 3.10 Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
6.45 Камедыя «Востраў Нім».
8.25 Камедыя «Таймшар».
10.00, 17.35, 22.00 Серыял «Кёрсці».
10.45 Меладрама «Каханне без перасадак».
12.30 Меладрама «Выпадковы муж».
14.00, 14.45, 15.25 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.10, 19.45, 22.50, 0.50 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Захад мужчынскай імперыі».
18.20 Камедыя «Елкі».
20.20 Камедыя «Укол парасонам».
23.10 Камедыя «Востраў скарбаў».
1.15 Камедыя «Пенелопа».
4.00 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».

## ТБ3

6.00 М/ф.
7.45 «Дачныя гісторыі».
8.10, 18.55, 1.35 Серыял «Забароненае каханне».

9.40, 3.55 Дак. серыял «Судовыя страсці».
10.30, 4.40 « Дак. серыял Па справах няпоўнагадовых».
11.25, 17.00 Дак. серыял «Справа Астахава».
12.15, 16.05 Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
13.10, 17.55 Серыял «Тайны следства».
14.10, 3.05 «Простыя складанасці».
14.40, 22.30 «Зорныя гісторыі».
15.35, 5.30 «Нераскрытыя тайны».
20.45, 0.05 Серыял «Сямейны дэтэктыў».
23.20 Серыял «Сакрэтны матэрыялы».
3.30 «Дачныя гісторыі».

## ТБ1000

6.30 Камедыя «Мой маленькі анёл».
8.10, 16.05 Меладрама «Вулюбёнцы Амерыкі».
10.00 Камедыя «Мой хлопец — псіх».
12.10 Трылер «Добры доктар».
13.50 Драма «12 гадоў рабства».
18.00 Драма «Самая п'яная акруга ў свеце».
20.00 Драма «Месца пад соснамі».
22.20 Фэнтэзі «Прылады смерці: Горад касцей».
0.30 Меладрама «Цяпер самы час».
2.15 Трылер «Сетка».
4.20 Драма «Мацярык».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

8.10 Камедыя «Кіндар-Вілейскі прывід».
9.50 Камедыя «Дэжа вю».
11.45 Меладрама «На раздарожжы».
13.30 Драма «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
14.50 Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
17.00 Меладрама «М+Ж».
18.30 Камедыя «Горка!».
20.20 Камедыя «Горка 2».
22.30 Трылер «Стальны матылёк».
0.30 Меладрама «Жаніх па аб'яве».

2.30 Драма «Ганна і камандор».
4.20 Меладрама «Гаспадыня «Белых начэй».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 9.20, 14.20, 16.50, 19.20 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
6.50, 13.30, 21.00, 1.10, 4.30 Гульні розуму.
7.15 Папулярная навука.
7.40 Золата Юкана.
8.30 Космас: Прастора і час.
10.10, 15.10, 20.10 Ракавая стыхія.
11.00 Мегазаводы.
11.50 Скарбашукальнікі.
13.55, 23.05 Навуковыя недарэчнасці.
16.00 Дзікая прырода Расіі.
17.40 80-я: Найвялікшыя футбольныя моманты.
18.30 90-я: Найвялікшыя футбольныя моманты.
21.50, 2.00, 5.15 Шырокі погляд.
22.40 Код небяспекі.
23.30, 3.40 Расследаванні авіякатастроф.
0.20 Уварванне на Зямлю.
2.50 Паранармальнае.

## DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Звышчалавечая навука.
9.40, 13.50 Хуткія і гучныя.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.
13.00, 6.25 Агалцелая рыбалка.
14.40, 5.35 А ты б выжыў?
16.20, 4.00 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
17.10, 4.45 Махінатары.
18.50 Аляска: сям'я з лесу.
19.40 Выжыць разам.
20.30 Рыбацкія легенды Якуба Вагнера.
22.10 Поўны фарсаж.
23.00 У пагоні за класікай.
23.50 Дом да аўто.
0.40, 3.10 Скарбашукальнікі Амерыкі.
1.30, 7.10 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

■ Эфір

# ГЛЯДЗІЦЕ І СЛУХАЙЦЕ

## Святочныя сюрпрызы ад Белтэлерадыёкампаніі

**Да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь тэле- і радыёканалы медыяхолдынга рыхтуюць прамыя трансляцыі з урачыстых мерапрыемстваў, тэматычныя паказ мастацкіх і дакументальных фільмаў, канцэртныя праграмы.**

**3 ліпеня ў 10.00 «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3» і «Беларусь 24» пачнуць прамую трансляцыю цырымоніі ўрачыстага ўскладання вянкоў да манумента Перамогі.**

Тэматычны кінапаказ на **«Беларусь 1»** прадстаўлены гераічнай **драмай «Брэсцкая крэпасць»** (07.20) **і вядомай кінааповесцю «У бой ідуць адны старыя» (10.40).**

**У дзённым эфіры (12.25)** гледачоў чакае **прэм'ера** чатырохсерыйнага прыгодніцкага **серыяла «Аперацыя «Тайфун». Заданні асаблівай важнасці»** (Расія, 2013). **У 16.10** яшчэ адна прэм'ера — **меладрама «Чатыры пары лета 1» і «Чатыры пары лета 2»** (Расія, 2012).

**Тэлеканал «Беларусь 2»** у ранішнім эфіры 3 ліпеня пакажа карціну з залатога фонду савецкай ваеннай кінакласікі — **драму Георгія Чухрая «Балада пра салдата»** (СССР, 1959), а таксама чатырохсерыйны ваенна-прыгодніцкі **серыял «Прывітанне ад «Кацюшы»** (Расія, 2013). **У 13.45** гледачы ўбачаць ваенна-прыгодніцкі **серыял «Тры дні лейтэнанта Краўцова»** (Украіна, 2011). **А ў 17.20** на «Беларусь 2» — прэм'ера чатырохсерыйнага ваеннага дэтэктыва **«Снег і попел»** (Расія, 2015). **У вячэрнім** святочным **эфіры** тэлеканал пакажа **ваенна-драматычны серыял «Ладага»** (Расія, 2014).

Адсвяткаваць Дзень Незалежнасці разам прапануе і **тэлеканал «Беларусь 3». У 10.40 гледачы ўбачаць гала-канцэрт XVIII тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда»** (Белтэлерадыёкампанія, 2015).

**У 12.20** усе ахвотныя змогуць здзейсніць экскурс у беларускую гісторыю. Адзін з самых вядомых праектаў беларускіх аніматараў **«Аповесць мінулых гадоў»** (Беларусьфільм, 2012) раскажа пра гісторыю гербаў беларускіх гарадоў. Стваральнікі здзейсняць падарожжа па ўсёй краіне і раскажуць пра геральдыку не толькі буйных, але і самых невялікіх мястэчак нашай краіны.

**У 15.15** на тэлеканале адбудзецца **прэм'ера фолк-оперы «Адвечная песня»** (Белтэлерадыёкампанія, 2015) па матывах вядомага твора Янкі Купалы. З 2002 яна ідзе на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, а ў лютым 2015 адбылася прэм'ера абноўленай версіі. **У 21.00** гледачоў чакае **сустрэча з ансамблем «Бяседа»** пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Леаніда Захлеўнага. Калектыў прадставіць праграму «Запрашаем на «Бяседу»!» (Белтэлерадыёкампанія, 2015).

**Тэматычны эфір, прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 71-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, таксама адбудзецца на каналах і станцыях Беларускага радыё.**

**Першы нацыянальны канал пра**цягне эфірную акцыю **«Тыдзень Памяці»**: у прагpаме **«Тэатр Беларускага радыё»** гучаць радыёспектаклі, прысвечаныя подзвігу народа ў барацьбе з фашызмам. 3 ліпеня будзе праведзены **тэматычны радыёдзень «Дзень Незалежнасці»**, у рамках якога нас чакаюць прамыя радыёрэпартажы з цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі ў Мінску. У інфармацыйных выпусках запланаваны прамыя ўключэнні ўласных карэспандэнтаў з абласцей Беларусі, якія раскажуць пра тое, як адзначаецца свята ў розных рэгіёнах краіны.

У эфіры **радыё «Культура»** можна будзе пачуць **выбраныя творы з кнігі ўспамінаў «Ніколі не забудзем: унукі пра вайну»**, а таксама святочныя канцэрты, прысвечаныя Дню Незалежнасці.

## СЕРАДА, 8 ЛІПЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Каханне — не бульба».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.40 Дэтэктыў «Логава Змея».**
**17.40 Серыял «Давай пацалуемся».**
**19.20, 23.50** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.30** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.50 Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой».**
**10.10** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**11.00 Фільм — дзецям «Госця з будучыні».**
**12.10, 21.40** «Экстрасэнсыдэтэктывы».
**13.10, 22.40 Серыял «Косці».**
**14.25** Беларуская кухня.
**15.00, 19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.55, 1.00 Серыял «Атэль «Вавілон».**
**21.00** Мазгавы штурм.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.00 Серыял «Быць чалавекам».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.45** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.25, 18.55, 0.15** Калейдаскоп.
**8.10 «Тры жанчыны Дастаеўскага». Драма.**
**9.50, 17.40 «Корцік». Кінааповесць. 2-я серыя.**
**11.05, 16.50** М/ф.
**12.00, 23.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнай артысткі СССР Аляксандры Клімавай.
**12.35 «Адалень-трава». Камедыя.**
**13.55** «Наперад у мінулае».
**14.20** «У гасцях у Барыса Аверына». Алег Басілашвілі.
**15.15 «Пецярбургская ноч». Драма.**
**19.05 «Наш чалавек у Сан-Рэма». Камедыя.**
**20.45** Калыханка.
**21.05** «Вечар цяжкага дня» на Славянскім базары.
**21.30 «Пастка для адзінокага мужчыны». Камедыя.**
**23.25** «Гарадкі і чалавекі». Жыццё і творчасць Ігара Губермана. Фільм другі.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 7.30, 1.05** PRO спорт. Навіны.
**7.15** Козел пра футбол.
**7.45** Спорт-кадр.
**8.15** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Другі раўнд. Францыя — Беларусь.
**9.55** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
**12.00** Баскетбол. НБА. Фінал. 2-і матч. «Голдэн Стэйт» — «Кліўленд».
**15.00, 23.00** Тэніс. Уімблдон.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Яна наваражыла забойства».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**



**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Практыка».**
**23.05 Серыял «Рані».**
**0.00** «Мужчынскае/Жаночае».
**0.55** «Сам-насам з усімі».
**1.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Меладрама «Каханне — гэта для дваіх».**
**10.10** «Далёкія сваякі».
**10.40 «Салдаты 7». Серыял.**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Эліксір маладосці».
**14.50, 23.20 «Турысты». Серыял.**
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Вам і не снілася»: «Бітва з чорным драконам». 1-я частка.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Дзённік кар'ерысткі».**
**21.55** «Глядзець усім!».
**23.00** «Прэзідэнцкі спартыўны клуб. 10 гадоў. Перамагаем разам!».
**0.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30, 1.30 Маст. фільм «Труфальдзіна з Бергама».**
**12.10** Дак. фільм «З нагоды. Запаланіць Вялікага».
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20 Серыял «Прыгажосць без ахвяр».**
**14.15, 17.20, 4.15 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**19.25 Маст. фільм «Ганна».**
**21.20, 23.15 Серыял «Класныя мужыкі».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Камедыя «Беражыце жанчын».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае».
Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Асуджаныя на «Оскар».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55** «Рассудзяць людзі».
**21.55, 23.10 Серыял «Чужое гняздо».**
**23.55** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**10.20** «Суд прысяжных».
**11.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**12.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.15 Серыял «Горад спакус».**
**14.50** «Справа густу».
**15.20, 16.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».**
**21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.25 Серыял «Пятніцкі. Глава другая».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.15, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.15, 19.20 Серыял «Скандал».**
**8.40, 18.15 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
**9.35, 13.55, 14.45, 15.45, 16.30, 18.10, 19.00, 21.00** «Хатняя крама».
**9.40 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».**



**10.30** «Адшукваецца адпачынак.
**11.00 Фантастыка «Абвілліён».**
**13.00 Серыял «Лекі ад страху».**
**14.10** Дак. серыял «Аповеды пра жывёл».
**14.45 Серыял «Рабыня Ізаўра».**
**16.15** «Золата маўчання».
**16.40 Серыял «Мёртвая зона».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Ізгой».**
**23.25 Серыял «Байкі са склепа».**

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 15.00, 3.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Васьмідзясятыя».
**10.00, 19.00** Скетчком «Сям'я 3 D».
**11.00** Камедыя «Таткі 2».
**13.00, 15.30** Серыял «Ералаш».
**13.30, 1.00** Серыял «Дочкі-маці».
**14.30, 3.00** «Летні фрэш».
**16.00, 20.00** Серыял «Сваццi 2».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**21.10** Меладрама «Вельмі небяспечная штучка».
**23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 22.50** Навіны культуры.
**10.15, 1.00** «Наглядальнік».
**11.15** Юбілей Канстанціна Райкіна. «Кароль Лір». Спектакль тэатра «Сатырыкон».
**13.50, 0.10** «Эдгар Дэга». Дак. фільм.
**14.00** «Правілы жыцця».
**14.30** «Правінцыйныя музеі Расіі». Горад Калуга.
**15.10** Пісьменнікі нашага дзяцінства. Л. Панцялееў.
**15.40, 1.55** «Паліглот». Вывучым англійскую за 16 гадзін!
**16.25** «Аксакавы. Сямейныя хронікі». Дак. серыял.
**17.10** IV Міжнародны фестываль актуальнай музыкі «Іншая прастора». Джонатан Харві. Джон Тавенер.
**18.00** «Сусветныя скарбы культуры».
**18.15, 0.20** «Ігар Там». Дак. фільм.
**19.15** «Акно ў Лацінскую Амерыку».
**19.55** «Добрай ночы, малыя!».
**20.10** «Невядомы ЭаС». Дак. фільм.
**20.50** «Сам-насам з гледачом».
**21.15, 23.10** Канстанцін Райкін, Дзяніс Суханаў, Агрыпіна Сцяклова ў спектаклі тэатра «Сатырыкон» «Рычард III».
**23.05** Мастсавет.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Сустрэча сяброў» у клубе «Высоцкі». 2007 год.
**7.00** Маст. фільм «Споведзь».
**8.45** М/ф «Песенька ў лесе».
**9.00** «Мінулы час».
**9.40, 11.00, 11.35, 12.35, 14.10, 15.40, 17.00, 17.35, 18.40, 21.40, 23.00, 0.40, 2.25, 3.15** Музычная настальгія.
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30, 17.30** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**12.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Таццяна Акунеўская.
**13.00** Маст. фільм «Дэпутацкі час».
**14.35** М/ф «Восеньская рыбалка».
**14.40** М/ф «Мышаня, якое хацела быць падобным на чалавека».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**18.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Уладзімір Этуш.
**19.00** Маст. фільм «Вяртанне».
**20.35** М/ф «Чаму ў ялінкі калючыя іголачкі».
**20.40** М/ф «Кароткія гісторыі».
**23.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Аркадзь Райкін.
**0.00** «Акулы пяра». Аляксандр Разенбаум. 1997 год.
**1.30** «Усё будзе так, як мы захочам». Фільм-канцэрт. 1989 год.
**3.00** М/с «Болек і Лёлек».
**4.00** Маст. фільм «Халодны сакавік».

### EUROSPORT

**4.00, 0.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-19)
**5.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны.
**6.30, 22.45** Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
**6.45, 14.00, 18.45, 23.00, 1.30** Веласпорт.
**7.45** Плаванне. Універсіяда.
**8.45** Спартыўная гімнастыка. Універсіяда. Фінал.
**10.00, 2.30** Лёгкая атлетыка. Універсіяда.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур дэ Франс.
**19.00, 22.25** Выбранае па серадах.
**19.10** Конны спорт.
**20.10** Гольф. Тур PGA.
**21.10** Гольф. Еўрапейскі тур.
**21.40** Гольф. Еўрапейскі тур. Жанчыны.
**21.55** Гольф-клуб.
**22.00, 22.15** All Sports.
**22.10** Парусны спорт. Яхт-клуб.
**22.35** WATTS.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00** Серыял «Кёрсці».
**6.45** Камедыя «Таймшар».
**8.25** Меладрама «Выпадковы муж».
**10.45** Камедыя «Захад мужчынскай імперыі».
**12.30** Камедыя «Елкі».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.00, 22.50, 0.40, 2.55, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Востраў скарбаў».
**18.20** Камедыя «Укол парасонам».
**20.20** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**23.10** Камедыя «Таксі 4».
**1.15** Меладрама «Каханне без перасадак».
**3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**4.00** Камедыя «Пенелопа».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50, 3.30** «Дачныя гісторыі».
**8.15, 19.00, 1.40** Серыял «Забароненае каханне».
**9.50, 3.55** Дак. серыял « Судовыя страсці».
**10.40, 4.40** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.35, 17.00** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.25, 16.05** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.20, 18.00** Серыял «Тайны следства».
**14.15, 3.05** «Простыя складанасці».
**14.45, 22.30** «Зорныя гісторыі».
**15.35, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**20.45, 0.10** Серыял «Сямейны дэтэктыў».
**23.25** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.25** Драма «Заганныя сувязі».
**8.05, 15.45** Трылер «Сетка».
**10.10** Драма «Валодаючы табой».
**12.00** Камедыя «Уік-энд у Парыжы».
**13.45** Камедыя «Экзамен для дваіх».
**17.50, 2.00** Меладрама «Бурлеск».
**20.00** Драма «Мех: Уяўны партрэт Дыяны Арбус».
**22.05** Камедыя «Мой хлопец — псіх».
**0.05** Драма «Самая п'яная акруга ў свеце».
**4.00** Камедыя «Па прыкметах сумяшчальнасці».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Палёты ў сне і наяве».
**7.50** Казка «Рэальная казка».
**9.35** Прыгоды «Краіна добрых дзетачак».
**11.05** Прыгоды «Вязень замка Іф».
**15.05** Меладрама «Вось гэта каханне!».
**16.40** Баявік «Спіраль».
**18.25** Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
**20.20** Драма «Географ глобус прапіў».
**22.25** Драма «Іуда».
**0.20** Драма «Каляфутбола».
**2.10** Трылер «Масакра».
**4.10** Драма «Паляванне на Вярвольфа».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 7.40, 12.40, 16.50** Суперзбудаванні Трэція рэйха.
**6.50, 9.20, 13.30, 14.20, 19.20** Гульні розуму.
**7.15** Папулярная навука.
**8.30** Ракавая стыхія.
**10.10, 15.10, 20.10** Шырокі погляд.
**11.00** Мегазаводы.
**11.50** Скарбашукальнікі.
**13.55, 23.05** Навуковыя недарэчнасці.
**16.00** Дзікая прырода Расіі.
**17.40, 21.00, 1.10, 4.30** Экстрэмальны экспрэс.
**18.30** Дзікі тунец.
**21.50, 2.00, 5.15** Дзікі тунец.
**22.40** Золата ў халоднай вадзе.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Уварванне на Зямлю.
**2.50** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** А ты б выжыў?
**9.40, 13.50** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**12.10, 18.00** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**13.00, 0.40, 3.10, 6.25** Мужчынскія бярлогі.
**14.40, 5.35** Не спрабуйце паўтарыць.
**16.20, 4.00** Пятая перадача.
**17.10, 4.45** Махінатары.
**18.50** Дом для аўто.
**19.40** Поўны фарсаж.
**20.30** У пагоні за класікай.
**22.10** Паляўнічыя на склады.
**23.00** Што ў вас у гаражы?
**23.50** Гаражнае золата.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Склады: бітва ў Канадзе.

## Гараскоп на

**АВЕН.** Вам неабходна найперш разабрацца ў сабе і сваіх пачуццях, а ўжо потым спрабаваць улазіць у чужое жыццё і даваць парады. Займіцеся домам: трэба проста надаць увагу свaёй сям'і — і ўсё пойдзе на лад. Невялікія эмацыйныя праблемы могуць турбаваць у пачатку тыдня, але неўзабаве ўсе яны вырашацца, і вы зможаце атрымліваць асалоду ад радасных і шчаслівых дзён. У канцы тыдня абвостраца камунікатыўныя ўласцівасці — добры час для зносін і працы з дакументамі.

**ЦЯЛЕЦ.** Ваша эмацыйнасць і адчувальнасць можа падвесці. Зараз вы вельмі ранімыя, і, на жаль, у такія моманты слабасці заўсёды знойдзецца той, хто зможа сапсаваць настрой яшчэ больш. Для захавання свайго ўнутранага свету неабходна выбудаваць магутную ахоўную сцяну ці паглыбіцца ў сябе. Праявіце мудрасць — успрымайце ўсе падзеі як урокі жыцця, што неабходна вывучыць, засвоіць і выкарыстоўваць у далейшым. Бо не толькі ў радасці пазнаецца наш сапраўдны свет.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вы зможаце праявіць сябе напоўніцу, з найлепшага боку і, галоўнае, з самага выгаднага для вас. У пачатку тыдня з'явіцца мноства новых ідэй, якія абавязкова захочацца рэалізаваць. Паспех пачынанняў наканаваны, але працаваць трэба будзе вам самім, нельга пускаць справы на самацёк. У гэты час вы зможаце лепш разабрацца ў людзях, пачнеце разумець іх скрытыя матывы, што вельмі дапаможа ва ўстанаўленні неабходных кантактаў і рэалізацыі сваіх планаў.

**РАК.** Давядзецца мець справу з законам. Гэта могуць быць адносіны з праваахоўнымі органамі, нават судом, ці проста афармленне дакументаў. У любым выпадку працэс мае вельмі важнае значэнне для вашага фінансавага становішча. Верагодна, вы дзесьці правініліся ў мінулым, і цяпер настаў час несці за гэта адказнасць. У выніку могуць быць фінансавыя страты і эмацыйныя ўзрушэнні. Не варта разлічваць, што правасуддзе будзе на вашым баку.

**ЛЕЎ.** Вельмі неспрыяльны тыдзень. Ён нясе мноства непрыемных момантаў і расчараванняў. У яго пачатку высокая рызыка быць ашуканым або абкрадзеным, хтосьці можа нажыцца на вашай няўважлівасці і неасцярожнасці. Магчыма, што вы самі здзейсніце непрыстойныя ўчынкі. У сярэдзіне тыдня вас чакае сур'ёзны эмацыйны ўпадак, дэпрэсія і нават бяссонніца. Але, на жаль, слязамі гору не дапаможаш. Вы не зможаце нічога змяніць і выправіць, ад чаго адчуванні будуць яшчэ горшымі. Гэты час трэба проста перажыць.

**ДЗЕВА.** Надыходзіць перыяд фінансавага развіцця. Вы зрабілі шмат намаганняў — і перад вамі адкрываюцца новыя перспектывы. Ёсць добры шанц зарабіць і палепшыць фінансавае становішча. Але існуе небяспека не адстаяць сваіх пазіцый. Да канца тыдня могуць з'явіцца рознагалоссі, і будзе вельмі складана прыняць правільнае рашэнне. У гэты час трэба праяўляць цвёрдасць і рашучасць, вы ж наадварот будзеце зачараваны сваім поспехам і пусціце ўсё на самацёк. Магчыма, гэта і ёсць самае правільнае рашэнне.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Ад вас спатрэбіцца праява міласэрнасці. Дапамагайце тым, хто просіць, не адмаўляйце. Вам такі падыход можа здавацца абсалютна бессэнсоўным, але, менавіта ахвяруючы ў нейкай ступені сабой і сваімі інтарэсамі, вы можаце здабыць шчасце, гармонію ва ўласнай душы. Шлях дабрадзейнасці прывядзе вас да прасвятлення. У такія дні трэба зразумець гэтую мудрасць і ўвасобіць яе ў сваім жыцці. Дапамагаючы іншым, будзьце сапраўды добрыя, не ўзгадвайце былых крыўдаў і не судзіце людзей. Вам гэта залічыцца.

**СКАРПІЁН.** Вы будзеце кідацца з крайнасці ў крайнасць, што можа не зусім спрыяльна адбіцца на адносінах з навакольнымі. Справа нават не ў тым, што яны не будуць разумець вас, а ў тым, што вы самі не зможаце разабрацца ў сабе і ўсвядоміць, што ж вам трэба. Спроба сумясціць у сабе пачуццёвы пачатак, моцныя эмоцыі і тонкую натуру разам з гнуткім розумам, лагічнасцю мыслення і халодным разлікам — задача не з лёгкіх. Розніца паміж гэтымі дзвюма супрацьлегласцямі, паміж знешнім і ўнутраным не будзе даваць спакою ўвесь тыдзень, пакуль вы канчаткова не вырашыце, што ж на самай справе ваша, а што фальшывае.

**СТРАЛЕЦ.** Вас можа адолець зайздрасць да чужога поспеху, асабліва ў справах, якія тычацца матэрыяльнай сферы. Калі амбіцыі не будуць рэалізаваны, то ад вас можна будзе чакаць чаго заўгодна. Спроба разжыцца за чужы кошт, прыбрацць чужое багацце ніяк не ўпрыгожыць, хоць з вашага пункту гледжання можа выглядаць вельмі бяскрыўдна і нават справядліва. Паспрабуйце знайсці сацыяльна прымальны спосаб палепшыць сваё фінансавае становішча і не шкодзіць пры гэтым іншым людзям.

**КАЗЯРОГ.** Жыццё не такое дрэннае, як гэта здаецца. У хуткім часе чакаюцца змены, у першую чаргу яны закрануць вашы погляды і стаўленне да навакольнага свету, магчыма, давядзецца прыняць тыя факты, пра якія вы нават не хацелі чуць. Тым не менш жыццё будзе паступова паляпшацца, з'явяцца больш радасныя перспектывы, праблемы пачнуць адступаць. Але вы так і не зможаце зрабіць выбар, у які бок рухацца далей, што больш цікава і карысна. Ваша лагічнае мысленне будзе не на вышыні, а інтуіцыя — нямой.

**ВАДАЛЕЙ.** Вы можаце ганарыцца сабой. Удасца адстаяць сваю пазіцыю, абараніць свае правы і быць цалкам задаволеным, бо атрымаецца шмат чаго дабіцца, паказаць сябе з найлепшага боку (у асноўным гэта тычыцца працы). Ва ўсіх справах фармальнага характару (звязаных з дакументамі) вам будзе спадарожнічаць поспех. Дасягненні і заслугі адкрыюць новыя перспектывы, але, на жаль, вы занадта летуценныя — можаце прыдумаць сабе значна больш, чым яно ёсць на самай справе, і за гэтым вобласкам з мрояў не ўбачыць свайго шляху.

**РЫБЫ.** У пачатку тыдня трэба будзе добра папрацаваць, магчыма, нават пазмагацца за сваё месца пад сонцам. Усё гэта, вядома, крыху стоміць, але ў якасці ўзнагароды за свае намаганні вы апынецеся літаральна ля рога багацця і зможаце значна палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, камфортнасць свайго жыцця, а заадно набыць і душэўны спакой. Адзіная ўмова, акрамя старанней працы, неабходна будзе праявіць цярпенне і вытрымку, каб дачакацца пладоў сваёй дзейнасці, а не сарваць іх зялёнымі.

## ЧАЦВЕР, 9 ЛІПЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.10** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Каханне — не бульба».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.15 Дэтэктыў «Логава Змея».**
**17.40 Серыял «Давай пацалуемся».**
**19.20, 0.30** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00** XXIV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Урачыстае адкрыццё.
**1.05** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.50 Серыял «Знішчальнікі. Апошні бой».**
**10.10** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**11.00 Фільм — дзецям «Госця з будучыні».**
**12.10, 21.40** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.10, 22.40 Серыял «Косці».**
**14.05** Хачу ў тэлевізар!
**14.25** Беларуская кухня.
**15.00, 19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.55 Серыял «Атэль «Вавілон».**
**21.00** Мазгавы штурм.
**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

**0.00 Серыял «Быць чалавекам». Заключныя серыі.**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.45** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 11.55, 18.25, 0.25** Калейдаскоп.
**8.10 «Наш чалавек у Сан-Рэма». Камедыя.**
**9.50, 16.50 «Корцік». Кінааповесць. 3-я серыя.**
**11.00, 16.20** М/ф.
**11.30, 0.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Міхаіла Бяляева.
**12.05 «Пастка для адзінокага мужчыны». Камедыя.**
**13.35** «Эпоха ВІА».
**15.20** «Сустрэчы ў «Буквае-дзе». Леанід Парфёнаў.
**18.00** «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Корцік».
**18.35** «Сіла веры».
**19.00 «Паклонніца». Меладрама.**
**20.45** Калыханка.
**21.00** «Вечар цяжкага дня» на Славянскім базары.
**21.30 «Слёзы капалі». Трагікамедыя.**
**22.50** «Подых струн». Эпоха Вівальдзі.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.30, 8.05, 1.05** PRO спорт. Навіны.
**7.45** Селфі.
**8.25** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Чвэрцьфінал. Літва — Беларусь.
**10.00** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
**12.05** Спорт-мікс.
**12.25** Баскетбол. НБА. Фінал. 3-і матч. «Клілэнд» — «Голдэн Стэйт».
**15.00, 21.00** Тэніс. Уімблдон.
**19.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1-ы кваліфікацыйны раўнд. Матч у адказ.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Практыка».**
**23.25 Серыял «Рані».**
**0.30** «Ціхвінская ікона. Вяртанне».
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Меладрама «Дзённік кар'ерысткі».**
**10.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40 «Салдаты 7». Серыял.**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Эліксір маладосці».
**14.50, 23.20 «Турысты». Серыял.**
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Вам і не сніласся»: «Бітва з чорным драконам».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Баявік «Кобра».**
**21.50** «Глядзець усім!».
**23.00** «Аўтапанарама».
**0.55** «Тайны свету».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00, 5.30** «Чаму я?».
**9.30, 2.25 Маст. фільм «Ішла сабака па раялі».**
**10.55 Маст. фільм «Адданы сябар».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 1.30 Серыял «Прыгажосць без ахвяр».**
**14.15, 3.50 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Ты не адзін».**
**19.25 Маст. фільм «Мая старэйшая сястра».**



**21.10, 23.15 Серыял «Класныя мужыкі».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Заставы ў акіяне. Вяртанне».
**12.20 Маст. фільм «Цыган».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Заставы ў акіяне. Вяртанне».
**18.00 Серыял «Апошні яныча».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55** «Рассудзяць людзі».
**21.55, 23.10 Серыял «Чужое гняздо».**
**23.55** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**10.20** «Суд прысяжных».
**11.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**12.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.15 Серыял «Горад спакус».**
**14.50** «Справа густу».
**15.20, 16.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».**
**21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.25 Серыял «Пятніцкі. Глава другая».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.10, 19.15, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.15, 19.20 Серыял «Скандал».**
**8.40, 18.15 Серыял «Кавараныя пакаёўкі».**
**9.25** «Кінабланкнот».
**9.40 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».**
**10.30** «Хобі TV».
**11.00 Меладрама «Час палюбоўнікаў».**
**12.50, 13.55, 15.45, 16.30, 18.10, 21.00** «Хатняя крама».
**14.15** Дак. серыял «Аповеды пра жывёл».
**14.45 Серыял «Рабыня Ізаўра».**
**16.40 Серыял «Мёртвая зона».**
**19.00** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Эфект матылька».**
**23.15 Серыял «Байкі са склепа».**

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 15.00, 2.30, 3.30** Скетчшоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Васьмідзясятыя».
**10.00, 19.00** Скетчком «Сям'я 3 D».
**11.00** Меладрама «Вельмі небяспечная штучка».
**12.50, 15.30** Серыял «Ералаш».
**13.30, 1.00** Серыял «Дочкі-маці».
**14.30, 3.00** «Летні фрэш».
**16.00, 20.00** Серыял «Сваціі 2».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**21.00** Камедыя «Агент 117: Місія ў Рыа».
**23.05, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 22.50** Навіны культуры.
**10.15, 1.00** «Наглядальнік».
**11.15** Да юбілею Канстанціна Райкіна. «Рычард III». Спектакль тэатра «Сатырыкон».
**13.50** «Томас Алва Эдысан». Дак. фільм.
**14.00** «Правілы жыцця».
**14.30** «Правінцыйныя музеі Расіі». Сядзіба «Астаф'ева» — «Рускі Парнас».
**15.10** Пісьменнікі нашага дзяцінства. Тамара Габэ.
**15.40, 1.55** «Паліглот». Вывучым англійскую за 16 гадзін!
**16.25** «Аксакавы. Сямейныя хронікі». Дак. серыял.
**17.10** IV Міжнародны фестываль актуальнай музыкі «Іншая прастора». Альфрэд Шнітке. Эдысан Дзянісаў.
**17.45** «Званічная прафесія». Дак. фільм.
**18.15** «Пароль — Валянціна Сперантава». Дак. фільм.
**19.15** Улада факта. «Горад пад зямлёй».
**19.55** «Добрай ночы, малыя!».
**20.10** «Успомніць усё. Галаграма памяці». Дак. фільм.
**20.50** «Сам-насам з гледачом».
**21.15, 23.10** Максім Аверын, Глафіра Тарханава, Паліна Райкіна ў спектаклі тэатра «Сатырыкон» «Прыбытковае месца».
**23.05** Мастсавет.
**0.20** «Мікалай Парфёнаў. Яго ведалі толькі ў твар...». Дак. фільм.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Тацяна Акунеўская.
**6.35, 8.10, 9.40, 11.00, 11.35, 12.35, 15.40, 17.00, 18.05, 21.40, 23.00, 3.40, 5.00, 5.35** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Дэпутацкі час».
**8.35** М/ф «Восеньская рыбалка».
**8.40** М/ф «Мышаня, якое хацела быць падобным на чалавека».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30, 18.00, 5.30** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**12.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Уладзімір Этуш.
**13.00** Маст. фільм «Вяртанне».
**14.35** М/ф «Чаму ў ялінкі калючыя іголкі».
**14.40** М/ф «Кароткія гісторыі».
**17.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Аркадзь Райкін.
**19.00** Маст. фільм «Уваравание».
**20.40** М/ф «Музычныя карцінкі».
**20.45** М/ф «Пеўнік і сонейка».
**23.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Клара Новікава.
**0.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Сустрэча сяброў» у клубе «Высоцкі». 2007 год.
**1.00** Маст. фільм «Спаведзь».
**2.45** М/ф «Песенька ў лесе».

### EUROSPORT

**4.00, 10.00, 21.00** Лёгкая атлетыка. Універсіяда.
**5.15** Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
**5.30, 19.00, 22.00, 1.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-19).
**6.45, 14.00, 18.45, 0.00** Веласпорт.
**7.45** Плаванне. Універсіяда.
**8.45** Скачкі ў ваду. Універсіяда.
**15.15, 2.30** Веласпорт. Нацыянальны тур дэ Франс.
**1.00** WATTS.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00, 3.10** Серыял «Кёрсці».
**6.45** Меладрама «Выпадковы муж».
**8.25** Камедыя «Елкі».
**10.45** Камедыя «Вострау скарбаў».
**12.25** Камедыя «Укол парасонам».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.00, 22.50, 0.50, 2.55, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Таксі 4».
**18.20** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**20.20** Меладрама «Пастка для нявесты».
**23.10** Меладрама «Каханне — гэта для дваіх».
**1.15** Камедыя «Захад мужчынскай імперыі».
**4.00** Меладрама «Каханне без перасадак».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45** «Дачныя гісторыі».
**8.10, 19.00, 2.00** Серыял «Забароненае каханне».
**9.35, 3.50** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**10.25, 4.40** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.20, 17.00** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.10, 16.05** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.05, 18.00** Серыял «Тайны следства».
**14.05, 3.25** «Простыя складанасці».
**14.35, 22.30** «Зорныя гісторыі».
**15.35, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**20.45, 0.30** Серыял «Сямейны дэтэктыў».
**23.30** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**0.20** «Рокіно».

### ТБ1000

**5.30, 12.40** Камедыя «Амаль знаёмыя».
**7.35** Баявік «Агент пад прыкрыццём».
**9.10** Камедыя «Мой маленькі анёл».
**10.40** Меладрама «Бурлеск».
**14.45** Драма «Мех: Уяўны партрэт Дыяны Арбус».
**16.50** Камедыя «Нагледзеўшыся дэтэктываў».
**18.30** Камедыя «Шэф».
**20.00** Меладрама «Святло вакол».
**21.55** Драма «Мяжа рызыкі».
**23.45** Драма «12 гадоў рабства».
**1.55** Драма «Куды прыводзяць мары».
**3.50** Меладрама «Двухсотгадовы чалавек».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Мамачкі».
**8.15** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**10.05** Камедыя «Хлопец з Марса».
**11.45** Камедыя «Дэжа вю».
**13.40** Прыгоды «Кур'ер з «Раю».
**15.20** Меладрама «Гаспадыня «Белых начэй».
**17.05** Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
**18.30** Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
**20.20** Драма «Чэмпіёны».
**22.00** Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
**0.05** Трылер «Стальны матылёк».
**1.55** Камедыя «Сябры сяброў».
**3.30** Меладрама «Прагулка па Парыжы».
**5.00** Меладрама «М+Ж».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 12.40, 16.50** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 7.40, 13.30** Гульні розуму.
**7.15** Папулярная навука.
**8.30** Шырокі погляд.
**9.20, 14.20, 19.20** Экстрэмальны экспрэс.
**10.10, 15.10, 20.10** Дзікі тунец.
**11.00** Мегазаводы.
**11.50** Скарбашукальнікі.
**13.55, 23.05** Навуковыя недарэчнасці.
**16.00** Гісторыя жывёльнага свету.
**17.40, 21.00, 1.10, 4.30** Дзікая будоўля.
**18.30, 21.50, 2.00, 5.15** Незвычайныя промыслы.
**22.40** Код небяспекі.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Уварванне на Зямлю.
**2.50** Параанармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.40, 13.50** Пятая перадача.
**12.10** Склады: бітва ў Канадзе.
**13.00, 6.25** Гульня на жыццё.
**14.40, 16.20, 18.50, 20.30, 22.10, 5.35** Ледзяное золата.
**23.00** Залатая ліхаманка.
**23.50** Дарожныя каўбоі.
**0.40, 3.10** Бітва за нерухомасць.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**4.00** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**4.45** Махінатары.
**5.36** Забойныя дылемы.

## СУБОТА, 11 ЛІПЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.25** Існасць.
**6.50 Меладрама «Цячэ рака Волга».**
**8.25 Меладрама «Дачка баняніста».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**10.20, 0.00 Серыял «Кухня».**
**11.25** Дача.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**12.50** Кулінарная дыпламатыя.
**13.25** Выхад ёсць.
**14.00,1.05 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Меладрама «Вальс-Бастон».**
**17.15** Нашы.
**17.30 Меладрама «Толькі пра каханне». 1-я і 2-я серыі**
**21.00** Панарама.
**22.00** XXIV Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2015». Фінал. Дзень першы «Славянскі хіт».
**0.55** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**7.30 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**9.25** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**9.55, 21.30** Тэлебарометр.
**10.00** Азбука смаку.
**10.30** Анімацыйны фільм «Лаві хвалю».
**12.00** Капейка ў капейку.
**12.35** «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
**14.10, 23.20 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**16.35 Баявік «Моцны арэшак 3: Адплата».**
**18.45 Баявік «Моцны арэшак 4».**
**21.00** Мазгавы штурм.
**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40 Камедыя «Аферысты Дзік і Джэйн забаўляюцца».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 13.15, 18.25, 0.25** Калейдаскоп.
**8.10** «АРТіШОК». Гісторыя вулічнага мастацтва.
**8.40, 17.15 «Начны візіт». Камедыя.**
**9.45 «Снайпер. Зброя помсты». Драма. 1—4-я серыі.**



**12.50** «Нябачны фронт». Марыя Галышкіна.
**13.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.55 «Усынаўленне». Драма.**
**15.20** Конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2015». Паўфінал.
**18.35 «Пакроўскія вароты». Камедыя.**
**20.45** Калыханка.
**21.00** «Вечар цяжкага дня» на Славянскім базары.
**21.25 «Пунсовы Першацвет». Драма.**
**23.45** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Тарас Юркевіч.

### БЕЛАРУСЬ 5

**6.45, 7.20, 0.25** PRO спорт. Навіны.
**7.00** Спорт-мікс.
**7.35** Піт-стоп.
**8.05** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч за трэцяе месца. Беларусь — Іспанія.
**9.40** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
**11.45** Баскетбол. НБА. Фінал. 5-ы матч. «Голдэн Стэйт» — «Клілэнд».
**14.10** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1-ы кваліфікацыйны раўнд. Матч у адказ.
**16.00** Тэніс. Уімблдон. Парны разрад. Жанчыны. Фінал.
**18.00** Тэніс. Уімблдон. Парны разрад. Мужчыны. Фінал.
**21.30** Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Харватыя — Беларусь.
**23.30** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Міхаіл Галусцян. «Зразумець і даравацъ».
**13.05** «Ералаш».
**13.15 Серыял «Маскоўская сага».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Барахолка».
**17.10 Камедыя «Кадрыля».**
**18.45** «ДОстояние РЕспублики: Андрэй Дзяменцьеў».
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.40 Маст. фільм «Кагемуша».**

### СТБ

**6.05 Маст. фільм «Недарэкі».**
**7.50** «Анфас».
**8.05** «Тайны свету».
**9.00** «Разумней не прыдумаеш».
**10.00** «Іншая краіна». «Зроблена ў Кітаі».
**11.25** «Мінск і мінчане».
**12.00 «Салдаты 3». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.55 Камедыя «Палацаты рэйс».**
**15.20** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.45** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.50** Камедыя «Час пік 2».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Нескароны».**
**22.30** «Дакументальны спецпраект»: «Сляды багоў», «Зброя багоў», «Нашчадкі багоў».
**1.05** «Масква. Дзень і ноч».

### МІР

**6.00, 8.40** М/ф.
**6.15 Маст. фільм «Волга-Волга».**
**8.10** «Саюзнікі».
**9.05** «Эксперыментатары».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Выйсці замуж за капітана».**
**11.55 Маст. фільм «Аляксандр».**
**15.15** «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**21.45** Кухня «Славянскага базару».
**22.00** XXIV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Саюзная дзяржава запрашае.
**23.30 Маст. фільм «Дыска».**
**1.30 Маст. фільм «Мая старэйшая сястра».**
**3.20 Маст. фільм «Светлы шлях».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Ха». Маленькія камедыі.
**7.40 Маст. фільм «Я цябе нікому не аддам».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.25** «Утаймавальнікі гуку».
**12.15 Камедыя «Сем нявест яфрэйтара Збруева».**
**14.30 Маст. фільм «Арыфметыка подласці».**
**16.15** «Вызваліцелі». «Паветраны дэсант».
**17.10** «Суботні вечар».
**19.00** «Вуліца Вясёлая».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40 Меладрама «Марная ахвяра».**
**22.30 Маст. фільм «Удар задыяку».**

### НТВ—БЕЛАРУСЬ

**6.05, 8.20 Серыял «Пляж».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.50** «Паедзем, паядзім!».
**11.50** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Тайны кахання».
**14.20, 16.20 Серыял «Псеўданім «Албанец».**
**18.05** «Следства вялі».
**19.25** «Летняе цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Самыя гучныя рускія сенсацыі».
**21.55** «Ты не паверыш!».
**22.45 Маст. фільм «Знайдзі мяне».**
**0.20** «ГРУ: Тайны ваеннай разведкі».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.25, 19.10, 21.00, 23.20** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**10.20, 11.30, 15.55, 16.45, 17.20** «Хатняя крама».
**10.35 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
**11.20** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.45 Трылер «Рыцары неба».**
**13.30 Камедыя «Усмешка бога».**
**15.40** «Кінаблакнот».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак.
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.30 Серыял «Шэрлак».**
**19.15 Трылер «Апакаліпсіс у Лос-Анджэлесе».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Трылер «Шаляніца».**
**23.25** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** Серыял «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турба міксер».
**12.00** Фэнтэзі «Ёка».
**14.00, 23.10, 1.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Хатняя кухня».
**15.00, 5.00** Серыял «Паласатае шчасце».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**20.30** Меладрама «Лепшая прапанова».
**23.30** «Нерэальная гісторыя».
**0.00** Скетчком «Студэнты».
**0.30, 4.30** «Лаві момант».
**1.30** Скетч-шоу «6 кадраў».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Трыццаць тры». Маст. фільм.
**11.50** «Яўген Лявонаў». Дак. фільм.
**12.30** Вялікая сям'я. Вера Галагалева.
**13.30, 1.55** «Музычная кулінарыя. Вівальдзі і Венецыя».
**14.15** Краіна птушак. «Совы. Дзеці ночы». Дак. фільм.
**15.10** «Гульня ў бісер». «М. Гоголь «Мёртвыя душы».
**15.50** «Мёртвыя душы». Маст. фільм.
**17.30** «Больш, чым каханне». Валянціна Сярова і Канстанцін Сіманаў.
**18.10** «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
**19.40** Юбілей Алены Камбуравай. «Раман з часам». Дак. фільм.
**20.30** «Алена Камбурова запрашае... Вечар у Тэатры музыкі і паэзіі».
**22.05** «Чалавек каля акна». Маст. фільм.
**23.40** «Белая студыя». Юрый Стаянаў.
**0.25** «Балада пра лясных рыцараў». Дак. фільм.
**1.20** «Аўстрыя. Зальцбург. Палац Альтэнау». Дак. фільм.
**1.50** «Заяц, які любіў даваць парады». М/ф для дарослых.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Прэс-экспрэс».1995 год.
**6.05, 9.40, 11.00, 15.40, 17.40, 21.40, 23.30, 0.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Уварванне».
**8.40** М/ф «Музычныя карцінкі».
**8.45** М/ф «Пеўнік і сонейка».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Клара Новікава.
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1968. Паўтор ад 2008 года.
**13.30** Маст. фільм «Шкура бегала мядзведзя».
**14.50** М/ф «Кіт і Кот».
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Міхаіл Жванецкі. 1-я частка.
**19.20** Дак. фільм «Яўген Габрыловіч».
**20.40** М/ф «Прыгоды Рэкса».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Схватка».
**0.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Уладзімір Этуш.
**1.00** Маст. фільм «Вяртанне».
**2.35** М/ф «Чаму ў ялінкі калючыя іголачкі».
**2.40** М/ф «Кароткія гісторыі».
**5.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Аркадзь Райкін.

### EUROSPORT

**4.00, 9.30, 11.00** Лёгкая атлетыка. Універсіяда.
**5.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-19).
**7.00, 14.00, 18.45, 23.00, 1.15** Веласпорт.
**8.00** Плаванне. Універсіяда. Фіналы.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур дэ Франс.
**19.00** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**20.00** Спідвей. Чэмпіянат Еўропы.
**0.00** Конны спорт.
**2.15** WATTS.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.10** Серыял «Кёрсці».
**6.45** Камедыя «Укол парасонам».
**8.25** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**10.45** Меладрама «Каханне — гэта для дваіх».
**12.30** Меладрама «Пастка для нявесты».
**14.05** Камедыя «Двое — гэта занадта».
**16.00** Камедыя «Шалёныя грошы».
**17.35, 22.00** Серыял «Пакетная здзелка».
**18.20** Камедыя «Праваднік розанскурыя».
**20.00, 22.50, 0.40, 2.50, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**20.20** Камедыя «Крама цудаў».
**23.10** Камедыя «Матулі».
**1.15** Камедыя «Таксі 4».
**4.00** Камедыя «Востраў скарбаў».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.15** «Нераскрытыя тайны».
**11.10** «Ргокіно».
**11.20** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.10** «Гісторыі выратавання».
**12.45, 0.55** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**17.00** М/ф «Птушыны спецназ».
**18.10, 4.40** Дак. фільм «Валерый Лявонцьеў. Час імчыць, нібы вершнік».
**19.40** Камедыя «Тата напракат».
**21.30** Трылер «Амерыканец».
**23.25** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.00** Драма «Уік-энд у Парыжы».
**7.35, 15.50** Драма «Танцуй са мной».
**9.45** Меладрама «Цяпер самы час».
**11.35** Трылер «Прэстыж».
**13.50** Меладрама «Крок наперад: Усё або нічога».
**18.00** Камедыя «1+1».
**20.00** Трагікамедыя «Кірмаш ганарыстасці».
**22.30** Драма «Словы».
**0.15** Драма «Месца пад соснамі».
**2.35** Драма «Легенды восені».
**4.50** Камедыя «Нагледзеўшыся дэтэктываў».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Баявік «Сіндром шахматыста».
**9.35** Камедыя «Сябры сяброў».
**11.10** Меладрама «Прагулка па Парыжы».
**12.40** Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».
**14.30** Драма «Неба паўшых».
**16.40** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**18.30** Баявік «Спіраль».
**20.20** Драма «Мужчынскі сезон: Аксамітная рэвалюцыя».
**22.20** Камедыя «Горка 2».
**0.25** Прыгоды «Упакавання».
**1.55** Трылер «Самнамбула».
**3.15** Драма «Балада пра бомбера».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Непаражальныя канструкцыі.
**6.50, 13.30** Гульні розуму.
**7.15, 13.55** Папулярная навука.
**7.40, 10.10, 20.10** Код небяспекі.
**8.30** Космас: Прастора і час.
**9.20, 14.20** Сутыкненне з астэроідам.
**11.00, 12.15** Навуковыя недарэчнасці.
**12.40** Больш чым фокусы.
**14.20** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**15.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**16.00** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.50** Тыраназаўр: чэмпіён па выжыванні.
**17.40** Гісторыя Вялікіх Азёр.
**18.30** Асушыць акіян.
**21.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**21.50, 1.10, 4.30** Расследаванні авіякатастроф.
**23.30, 2.50** Горшае надвор'е ўсіх часоў?
**0.20, 3.40** Карставыя варонкі.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.35** Дом для аўто.
**8.50, 15.30** Поўны фарсаж.
**9.40, 16.20, 0.40, 6.25** У пагоні за класікай.
**10.30** Дарожныя каўбоі.
**11.20** Залатая ліхаманка.
**12.10** Ледзяное золата.
**13.00, 4.00** Гаражнае золата.
**13.50, 23.50** Паляўнічыя на склады.
**14.40** Што ў вас у гаражы?
**18.00** Дамы на дрэвах.
**18.50** Мужчынскія бярлогі.
**19.40** Бар на заказ.
**20.30, 21.20** Марпех Дуг.
**22.10** Лепшыя ў сваёй справе.
**23.00** Рыбацкія легенды Якуба Вагнера.
**1.30** Выжыць разам.
**2.20** Перш за ўсё — самалёты.
**3.10** Інжынерыя немагчымага.
**4.45** Як гэта ўстроена?
**5.10** Як гэта зроблена?
**7.10** Эфект Карбанара.

## 9 фактаў пра ...

## МЭРЫЛІН МАНРО



**Бландзінка ўсіх часоў і народаў, сэкс-сімвал XX стагоддзя — гэта Мэрылін Манро. Легендарны жаноцкі вобраз капіруе і яшчэ будзе капіраваць не адно пакаленне актрыс і звычайных жанчын. Яна не проста стала эталонам, яна сама стварыла яго з сябе. Жыццё яе было незвычайным, яркім, захапляльным і абарвалася раптам, як у звыш'яркіх зорак.**

**1.** Манро ўспрымалі толькі як вельмі прыгожую, але не занадта разумную актрысу, нават лічылі дурной бландзінкай (яна, між іншым, ненавідзела гэты стэрэатып). Аднак яе IQ складаў 168 балаў.

**2.** Мэрылін шмат увагі надавала самаадукацыі і прачытала многа кніг. Яе асабістая бібліятэка на час смерці складалася з больш чым 400 тамоў, сярод аўтараў былі Фрэйд, Талстой, Фіцджэральд, Дастаеўскі, Камю, Джойс і іншыя.

**3.** Дзядуля Мэрылін (Оціс Манро) памёр ад агульнага паразу (прыдуркаватасць, форма душэўнай хваробы), маці Мэрылін на працягу многіх гадоў ляжала ў псіхіятрычным шпіталі.

**4.** У канцы Другой сусветнай вырашылі: найлепшым маральным стымулам для салдат стануць здымкі сімпатычных дзяўчат з заводаў, якія пакажуць, як яны робяць свой уклад у барацьбу з ворагам. На заводзе фатограф Дэвід Кановер убачыў 19-гадовую шатэнку Норму Джын Догерці,



якая займалася праверкай парашутаў і афарбоўкай самалётаў. Пасля фотасесіі ён вырашыў, што з Нормы атрымаецца выдатная мадэль. Менавіта гэтыя першыя здымкі летам 1945 года лічаць яе першымі крокамі да славы.

**5.** Падчас здымак карціны «Сверб сёмага года» адносіны Манро і яе другога мужа — бейсбаліста Джо Дзі Маджыа — усё больш пагаршаліся з-за яго рэўнасці. Тады Мэрылін запрасіла яго на здымкі, каб той пераканаўся, што ўсё ў парадку. Але якраз у той дзень здымалася легендарная сцэна з патокам паветра з вентыляцыйнага люка, які падымае ўверх спадніцу Мэрылін. Джо быў у лютасці, і неўзабаве іх дзевяцімесячны шлюб распаўся.

**6.** Большасць рэжысёраў скардзілiся на тое, што з Манро немагчыма было працаваць. Яна пастаянна забывалася і блытала словы, спазнялася на здымкі або зусім знікала на некалькі дзён. Патрабавалася 20-40 дубляў, каб атрымаўся добра эпізод.

**7.** У апошні дзень здымак акцёр фільма «Непрыкаяныя» Кларк Гейбл заявіў: «Госпадзе Ісусе! Я шчаслівы, што гэты фільм нарэшце дазняты! Манро давяла мяне да сардэчнага прыступу». На наступны дзень Гейбл атрымаў інфаркт міякарда і праз 11 дзён памёр.

**8.** Існуе шырока распаўсюджаны міф, што Манро падпілоўвала абцас на адной з туфляў на паўсантыметра, каб дамагчыся сваёй знакамітай віхляючай паходкі, як у фільме «У джазе толькі дзяўчаты». На самай справе яна гэтага не рабіла, а такой паходкі актрыса дамаглася падчас здымак у фільме «Ніягара».

**9.** Мэрылін Манро зрабіла некалькі пластычных аперацый. Хірургі выправілі яе нос, змянілі форму падбародка і вырашылі праблему з валасамі, якія раслі трохкутным выступам на лбе.

# НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**16.** Будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі — галоўнай універсальнай навуковай бібліятэкі — стала сапраўды агульнанародным праектам. Сёння бібліятэчны фонд складае каля 10 млн адзінак захоўвання. Асаблівую каштоўнасць уяўляе з сябе паўмільённы ўнікальны збор нацыянальных дакументаў, выдадзеных на тэрыторыі Беларусі з пачатку XIX стагоддзя і да нашага часу, а таксама выданняў і матэрыялаў пра нашу краіну, у тым ліку і замежных.

**17.** З 1992 года праводзіцца міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Яго мэты — аб'яднаць творчыя сілы блізкіх па культуры краін і стварыць мірную супольнасць. Гэты фестываль з'яўляецца адной з галоўных падзей у культурным жыцці не толькі нашай краіны, але і, без перабольшання, усіх краін былога Савецкага Саюза. Усяго за час існавання «Славянскага базару» яго ўдзельнікамі станавіліся прадстаўнікі 70 краін.






**18.** 4 аб'екты, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны, за апошнія гады былі ўключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Мірскі і Нясвіжскі замкі, адрэстаўраваныя ў 2010 і 2012 гадах адпаведна, сёння з'яўляюцца неад'емнымі элементамі іміджу нашай краіны.

**19.** У Беларусі з'явілася свая «сіліконавая даліна» — Парк высокіх тэхналогій — асобная эканамічная зона са спецыяльным падаткова-прававым рэжымам. Мэта праекта — стварыць у краіне спрыяльныя ўмовы для развіцця індустрыі экспартна арыентаванага праграмавання, развіцця іншых экспартных вытворчасцяў, заснаваных на новых і высокіх тэхналогіях, а таксама для канцэнтрацыі кадравага, навукова-вытворчага і інвестыцыйна-фінансавага патэнцыялу. З падобнай мэтай створаны і Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», які ўяўляе з сябе тэрытарыяльнае ўтварэнне плошчай каля 80 кв.км з асаблівым прававым рэжымам для забеспячэння камфортных умоў вядзення бізнесу.

**20.** Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» акрэдытаваны Міжнароднай федэрацыяй асацыяцый кінапрадзюсараў (FIAPF) як спецыялізаваны конкурсны фестываль фільмаў краін Балтыі, Цэнтральнай Азіі, а таксама краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Кожны год падчас «Лістападу» гледачам прадстаўляецца больш за 150 карцін з прыкладна паўсотні краін.

**21.** Ахова навакольнага асяроддзя — адзін з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў нашай краіне. У нас пяць ахоўваемых дзяржавай запаведных тэрыторый, працу якіх падтрымлівае ЮНЕСКА: нацыянальны парк «Белавежская пушча», Бярэзінскі біясферны запаведнік, нацыянальны парк «Браслаўскія азёры», нацыянальны парк «Нарачанскі», нацыянальны парк «Прыпяцкі».

**22.** Пра рост аўтарытэту нашай дзяржавы на міжнароднай арэне сведчаць і рэйтынгі, складзеныя шматлікімі арганізацыямі. Згодна з дакладам Сусветнага банка, 80% насельніцтва нашай краіны адносіцца да сярэдняга класа. Па гэтым паказчыку Беларусь абганяе ўсе астатнія краіны з сярэднім узроўнем даходу. Наша краіна паднялася на 72 пазіцыі ў даследаванні групы Сусветнага банка па паказчыку «Вядзенне бізнесу»: са 129-га месца, якое яна займала ў 2007 годзе, на 57-е — у 2014-м.

**23.** У мінулым годзе адзіны ў свеце паўнапрыводны двухвосевы кар'ерны самазвал БелАЗ-75710 грузападымальнасцю 450 тон быў занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса. У даўжыню ён такі ж, як два прыпаркаваныя адзін за адным двухпавярховыя лонданскія аўтобусы, а важыць айчынны гігант больш, чым цалкам загружаны пасажырскі самалёт Airbus A380 — найбуйнейшы авіялайнер у свеце.

**24.** Пачалося будаўніцтва Петрыкаўскага горна-абагачальнага комплексу — гэта найбольш значная сыравінная база для падтрымання і павелічэння вытворчай магутнасці Беларуськалія. Петрыкаўскае радовішча мае прагнозныя запасы 2 200 мільёнаў тон калійнай солі. Першую чаргу горна-абагачальнага камбіната плануюць запусціць у снежні 2019 года, каб праз 3 гады — у снежні 2021-га — вывесці камбінат на праектную магутнасць.





**25.** У 2011 годзе пачалася рэалізацыя праекта па будаўніцтве Беларускай АЭС. Запланавана, што на станцыі будзе два энергаблокі з рэактарамі тыпу ВВЭР-1200 (У-491) магутнасцю да 1200 МВт кожны. Праектаваная магутнасць АЭС складае 2,4 тысячы МВт. Згодна з планамі, першы блок АЭС павінен быць уведзены ў 2018 годзе, другі — у 2020 годзе.

**Падрыхтавала Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Надзеі БУЖАН, Марыны БЕГУНКОВАЙ, БЕЛТА.**

## НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ — ГЭТА...

**Напярэдадні свята «Звязда» высветліла, як такое простае на першы погляд паняцце ў дачыненні да краіны разумеюць людзі розных узростаў, прафесій і лёсаў.**



**Валерый БАРАДЗЕНЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па бюджэце і фінансах:**

— Незалежнасць — гэта свабода поглядаў, думак і дзеяння. Але гэтыя паняцці неад'емныя ад адказнасці кожнага грамадзяніна за ўласныя месца працы і сям'ю. Такі своеасаблівы бытавы патрыятызм: любоў да сваіх дома, вуліцы, вёскі ці горада, калектыву і краіны агулам. У сучасным свеце, падуладным працэсу глабалізацыі, вельмі складана быць цалкам незалежнымі. Бо ў транснацыянальных міжнародных кампаній грашовых сродкаў часам больш, чым у бюджэтах некаторых дзяржаў. Мы не можам адмаўляцца ад гэтага факту.

Таму сёння менавіта каштоўнасці, якія аб'ядноўваюць людзей і дазваляюць называцца адзіным народам, складаюць аснову незалежнасці. Разуменне, што мы жывём на гэтай зямлі і з'яўляемся яе гаспадарамі, дазваляе працаваць на перспектыву і быць спакойнымі за будучыню краіны. Да каштоўнасцяў, якія аб'ядноўваюць, можна аднесці і Перамогу Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне. Нездарма мы адзначаем свята незалежнасці ў дзень вызвалення Мінска ад нямецкіх войскаў і лічым яго адным з галоўных.



**Аляксей СКАКУН, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар эканамічных навук, прафесар, старшыня Беларускага аграпрамысловага саюза, старшыня сельскагаспадарчага кааператыва «Астрамечава» Брэсцкага раёна:**

— Адзін з галоўных аспектаў незалежнасці краіны — гэта харчовая бяспека. З ёй у Беларусі, я лічу, сітуацыя складваецца больш чым станоўча. У апошні час мы бачым рост усіх паказчыкаў у аграрна-прамысловым комплексе. І тут галоўная задача — задаволіць спажывецкую патрэбу грамадзян, з чым наша краіна паспяхова спраўляецца.

Калі ў Беларусь прыязджаюць замежныя госці, яны здзіўляюцца, як у гэтым плане ў нас усё добра арганізавана. Але я бачу і перспектыву развіцця аграрнага сектара ў тым, каб болей спалучаць яго з навукай і забяспечваць кваліфікаванымі навуковымі кадрамі. Бо праца на зямлі не павінна абмяжоўвацца фізічнай, а наадварот, мусіць падтрымлівацца разумовай.



**Наталля ЛАЗАРЭВІЧ, краўчыха ў эксперыментальным цэху на прадпрыемстве «Элема», малады спецыяліст:**

— Для мяне слова «незалежнасць» асацыюецца перш за ўсё з магчымасцямі. Я маю на ўвазе адукацыю. Год таму я скончыла Баранавіцкі дзяржаўны каледж лёгкай прамысловасці па спецыяльнасці мадэльер-канструктар. Цяпер працую на вялікім прадпрыемстве і лічу, што гэта стала магчымым дзякуючы незалежнасці Беларусі і існуючай уласнай сістэме адукацыі.

Дарэчы, у каледжы ў мяне былі добрыя адзнакі, і таму я змагла паступіць на завочнае аддзяленне ў Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт тэхналогіі і дызайну на спецыяльнасць «тэхнолаг швейнай вытворчасці». Тут ужо трэба сказаць «дзякуй» Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі, бо я вучуся на бюджэце. Зразумела, што ад якасці адукацыі залежыць не толькі мая будучыня, але і ўсёй дзяржавы. Як без ведаў можна зрабіць сябе і краіну лепшымі?



**Уладзімір БАМБУРАЎ, старшыня Беларускага саюза афіцэраў, генерал-маёр у адстаўцы:**

— Незалежнасць — гэта тое, з чым прыйшоў да ўлады Аляксандр Лукашэнка. Ён публічна заявіў, што наша Канстытуцыя, якую мы на той час прымалі, будзе цалкам накіравана на росквіт самастойнасці краіны. І таму незалежнасць для Беларусі — падмурак для стварэння яе дзяржаўнасці.

Сёння незалежнасць — гэта не адасобленае існаванне краіны, а перш за ўсё, наладжаная камунікацыя з саюзнымі дзяржавамі на роўных умовах. Суверэнная краіна тая, што развіваецца па ўласным народнагаспадарчым плане, мае сваю ідэалогію, канстытуцыю і, безумоўна, моцныя ўзброеныя сілы і войска, якое ахоўвае тэрыторыю, пастаўленую ў рамкі дэмаркацыі межаў.



**Віктар ШНІП, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:**

— Для мяне незалежнасць непасрэдна асацыюецца з самой нашай краінай, суверэннай дзяржавай, прызнанай ва ўсім свеце. Тым больш што ўсе атрыбуты для гэтага мы ўжо маем. Напрыклад, нашы спартсмены ўдзельнічаюць у спаборніцтвах, прадстаўляючы Рэспубліку Беларусь. На алімпіядах і турнірах яны часта бываюць у ліку першых. А гэта значыць, што наша краіна не толькі незалежная, але і не апошняя сярод астатніх.

Як кнігавыдаўцы мы бяром удзел у кніжных выставах, што адбываюцца за мяжой, часта — у Еўропе. Там мы прадстаўляем не толькі «Мастацкую літаратуру», але і агулам Беларусь, якая мае сваю гісторыю, культуру і, зразумела ж, кнігавыдавецкую дзейнасць. Прыемна, што нашы кнігі займаюць прызавыя месцы. Гэта сведчыць, што незалежнасць краіны не прыдуманая, а сапраўдная, дасягнутая ўнёскам кожнага грамадзяніна. І такія перамогі — каштоўныя камяні ў іміджавай скарбонцы дзяржавы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# АПОШНІЯ ДНІ ВАЙНЫ. ПЕРШЫЯ ДНІ МІРУ

**3 ліпеня 1944 г. ад нямецкіх войскаў быў вызвалены Мінск. У канцы мінулага стагоддзя гэтая дата набыла статус дзяржаўнага свята нашай краіны — Дня Незалежнасці (Дня Рэспублікі). Наш артыкул прысвечаны некаторым старонкам гісторыі Беларускай наступальнай аперацыі ў час Вялікай Айчыннай вайны.**

Сусветная грамадства, у першую чаргу стараннямі англійскіх гісторыкаў (Лідэла Гарта, Палма Дата, Уільяма Шырэра і інш.), стварыла на заходнееўрапейскі манер храналогію Другой сусветнай вайны. Вось як выглядае ў ёй 1944 год: **27 студзеня:** канчатковае вызваленне Ленінграда ад нямецкай блакады; **15 сакавіка — 4 красавіка:** Палеская наступальная аперацыя войскаў 2-га Беларускага фронту; **10 красавіка:** вызваленне Адэсы; **9 мая** — вызваленне Севастопаля; **4 чэрвеня:** саюзныя войскі ўступілі ў Рым; **6 чэрвеня:** пачатак высадкі ў Нармандыі; **13 чэрвеня:** першы абстрэл Лондана ракетамі «Фау-1»; **3 ліпеня:** вызваленне Мінска; **20 ліпеня:** уваходжанне савецкіх войскаў у Польшчу; **20 ліпеня:** замах на Гітлера; **1 жніўня — 2 кастрычніка:** Варшаўскае паўстанне; **15 жніўня:** высадка саюзнікаў у Паўднёвай Францыі; **25 жніўня:** французскае войска (дывізія Леклерка) увайшла ў Парыж; **8 верасня:** савецкія войскі ўвайшлі ў Балгарыю; **28 верасня — 20 кастрычніка:** Бялградская аперацыя савецкіх войскаў і югаслаўскіх партызанаў; **4 кастрычніка:** высадка англійскіх войскаў у Грэцыі; **23—26 кастрычніка:** бітва паміж амерыканскім і японскім флотамі каля Філіпін; **7 лістапада:** выбранне Ф. Рузвельта на чацвёрты тэрмін прэзідэнтам ЗША; **12 лістапада:** патапленне англійскай авіяцыяй лінкора «Тырпіц».

Не бывае гісторыі без містычнага. 22 верасня 1943 г. адважныя беларуская жанчыны Алена Мазанік, Марыя Осіпава і Надзея Траян, выкарыстаўшы партызанскую міну, ліквідавалі галоўны «сімвал» нямецкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі — гаўляйтара Кубэ. А праз дзень, 23.09.1943 г., Чырвоная Армія, нібы адгукнуўшыся на гэты выбух, пачала вызваленне Беларусі. Першым вызваленым горадам стаў Камарын. Але гэта была толькі прэлюдыя да галоўнага.

Падрыхтоўка да бітваў 1944 г. вялася не толькі шляхам павелічэння колькасці гармат, снарадаў, танкаў, самалётаў, а і шляхам актывізацыі патрыятычна-выхаваўчай работы. А ў ёй амаль за месяц да пачатку Беларускай аперацыі з'явіліся і праблемы. Пэўнае святло на гэта пралівае ліст сакратара Беластоцкага падпольнага абкама партыі В.Е. Самуціна да начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі П.К. Панамарэнкі. «У звароце ЦК КП(б)Б — гаворыцца ў ім, — дадзена ўстаноўка аб нязменнасці межаў 1941 г. У той жа час Савецкі ўрад зрабіў заяву аб тым, што ён не лічыць гэтыя межы нязменнымі і пры пэўных умовах згодзен на лінію Керзана». («Лінія Керзана» — мяжа паміж Расіяй і Польшчай з уступкамі для Польшчы, прапанаваная ў 1919 г. міністрам замежных спраў Вялікабрытаніі лордам Керзанам. — **Аўт.**). Васіль Емяльянавіч прасіў галоўную партыйную асобу Беларусі даць на гэты конт неабходнае тлумачэнне. Але на той момант ужо распачыналася вялікая гульня вакол пабудовы межаў у пасляваеннай Еўропе. Актыўную ролю ў ёй адыгрывалі не толькі Сталін, а і іншыя кіраўнікі краін-пераможцаў — ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі. Усе хацелі бачыць еўрапейскі кантынент падпарадкаваным сваім інтарэсам. Сталін марыў аб стварэнні на захадзе федэрацыі прасавецкіх дзяржаў. Але план гэты праваліўся, а межы вярнуліся да свайго першапачатковага існавання. Што тычыцца Беласточчыны, то яна, згодна са сталінскім планам, адышла ў жніўні 1945 г. да Польшчы.

**Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі — па логіцы завяршальнага этапу вайны і як камандуючы 1-м Беларускім фронтам — павінен быў першым са сваімі войскамі ўвайсці ў Берлін. Але гэтага не адбылося.**

Беларуская наступальная аперацыя пачалася 23 чэрвеня 1944 г., працягвалася амаль два месяцы. Ёю кіравалі К.К. Ракасоўскі (1-ы Беларускі фронт), Г.Ф. Захараў (2-гі Беларускі), І.Д. Чарняхоўскі (3-ці Беларускі), І.Х. Баграмян (1-ы Прыбалтыйскі). Каардынавалі дзеянні франтоў члены Стаўкі Вярхоўнага Галоўнага камандавання Г.К. Жукаў і А.М. Васілеўскі.

У аперацыі ўдзельнічалі дзве яркія «зоркі», якія праходзяць праз усю гісторыю Вялікай Айчыннай вайны — Г.К. Жукаў і К.К. Ракасоўскі. Канстанцін Канстанцінавіч — па логіцы завяршальнага этапу вайны і як камандуючы 1-м Беларускім фронтам — павінен быў першым са сваімі войскамі ўвайсці ў Берлін. Але гэтага не адбылося: яго паставілі на чале 2-га Беларускага фронту, а Жукаў узначаліў 1-ы. Сталін так пракаментаваў гэты момант: «Першым у Берліне павінен быць прадстаўнік рускага народа. Гэта дыктуецца самім ходам гісторыі».

Безумоўна, І.В. Сталін высока цаніў талент К.К. Ракасоўскага (нават падарыў яму аднойчы букет руж). Канстанцін Канстанцінавіч за ўдзел у Беларускай аперацыі ўзнагароджаны найвышэйшай маршальскай узнагародай — ордэнам Перамогі. Палкаводзец называў сябе маршалам двух народаў — рускага і польскага. Крыўды на Сталіна ён не трымаў, нават асабліва падкрэсліваў, што ён і Сталін нарадзіліся ў адзін дзень — 21 снежня.

Ракасоўскі і Жукаў — два характары, дзве культуры. Адзін выхоўваўся пад уплывам заходнееўрапейскай цывілізацыі, другі — усходнеславянскай. Аб'ядноўвалі іх высокія творчыя адносіны да ваеннай справы. Але, безумоўна, на Жукаве як на палкаводцы ад першага да апошняга званка вайны (нават ад Халхін-Гола) ляжала найвышэйшая адказнасць за абарону ўсёй савецкай краіны. Не выпадкова, што менавіта да яго ў снежні 1941 г. звярнуўся Сталін з пытаннем: «Не як чалавек чалавеку, а як камуніст камуністу скажыце: здадзім мы немцам Маскву ці не?» Жукаў цвёрда адказаў: «Не, калі дабавіце крыху бранятанкавых войскаў і пяхоты». Просьба была задаволена, і Жукаў выканаў абяцанае.

Беларуская наступальная аперацыя (1,2,3-і Беларускія франты, 1-ы Прыбалтыйскі фронт, 144 партызанскія брыгады, 80 партызанскіх атрадаў) завяршылася разгромам адной з самых моцных груповак нямецкіх армій — групы армій «Цэнтр». Толькі рэшткі яе дайшлі да Берліна, дзе былі прыняты Гітлерам і іншымі кіраўнікамі Рэйха. У аперацыі з абодвух бакоў удзельнічалі 3 млн 600 тыс. салдат і афіцэраў (савецкіх і нямецкіх), 6100 танкаў, 6650 самалётаў. Першыя сцягі Перамогі ў Мінску былі ўзняты 3 ліпеня над домам Чырвонай Арміі і на пастаменце каля Дома ўрада.

У 1946 г. на пасяджэнні Нюрнбергскага суда ў аднаго з кіраўнікоў карнай экспедыцыі «Котбус» запыталі: «Супраць якой колькасці партызанаў вы змагаліся?» У адказ пачулі: «Іх было шмат. Гэта быў народ». Словы пацвярджаюцца шматлікімі архіўнымі звесткамі, у тым ліку і Мінскага партызанскага злучэння. Перад пачаткам Беларускай аперацыі ў ім знаходзілася 10 887 чалавек, сярод якіх асноўную масу складалі мясцовыя жыхары — 8215 чал. (75,5%). У верасні 1942 г. камандзіру Мінскага партызанскага злучэння В.І. Казлову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.


1121-ы дзень вайны. 16 ліпеня 1944 г. Парад партызанаў у Мінску. (Карціна Яўгена Зайцава.)

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі вялі барацьбу з захопнікамі польскія партызанскія атрады імя Касцюшкі, імя Ванды Васілеўскай у складзе партызанскай брыгады імя Ленінскага камсамола і іншыя. За мужнасць і адвагу каля 700 палякаў з 2500 узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Каля пасёлка Леніна Магілёўскай вобласці атрымала баявое хрышчэнне польская дывізія імя Тадэвуша Касцюшкі, ядро будучай першай польскай арміі. Яна разам з савецкімі войскамі ўдзельнічала ў вызваленні Брэста і Польшчы. Хочацца сказаць і наступнае. Каля 600 тысяч грамадзян Беларусі, мабілізаваных у 1944 г., прымалі ўдзел у складзе Беларускіх франтоў у ачышчэнні польскай зямлі ад гітлераўскіх захопнікаў. Многія з іх назаўсёды засталіся ляжаць у брацкіх магілах.

9 мая 1945 г. урады ЗША, Францыі, Аўстраліі, Чэхаславакіі шчыра павіншавалі ўрад БССР з Вялікай Перамогай і першай гадавінай яе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Сапраўднай пагрозай для мірнага насельніцтва былі мінныя палі, на якіх у Беларусі з 1944 па 1946 г. загінула 1670 цывільных грамадзян, 602 з іх — дзеці. Атрады па размініраванні на адпаведнай тэрыторыі СССР ствараліся па спецыяльным загадзе І.Сталіна як неабходная ўмова для разгортвання аднаўленчых работ. Кіраўніцтва размініраваннем было даручана арганізацыям Асаавіяхіма. Удзельнік небяспечнай працы па статусе прыраўноўваўся да ветэрана Вялікай Айчыннай вайны. Першыя мінныя палі ў Беларусі з'явіліся ў 1943 г., калі савецка-германскі фронт не толькі пралёг, але і затрымаўся на рубяжах рэк Заходняя Дзвіна, Проня, Дняпро, Прыпяць. Небяспечныя выбуховыя рэчы пакрывалі значныя часткі Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай абласцей. (Агульная плошча пакрытай мінамі зямлі складала 34 877 кв.км. У 40-я гады сярод найлепшых валанцёраў значыліся дзяўчаты-размінёры: Н. Давольцава, Р. Акуліч, С. Гарэлік, Т. Бажонак і іншыя. Ніна Давольцава ў адзін з выхадаў у поле была паранена, але пасля папраўкі зноў папрасілася ў атрад. Ачыстка Беларусі ад мін пайшла больш актыўна, калі Германія выслала БССР карты размяшчэння мінных палёў. У 1945 г. у размініраванні нашай краіны прынялі ўдзел 7 575 чалавек, з іх загінулі 39.

Якім быў свет у апошнія дні вайны і адразу пасля яе заканчэння? Перастаў існаваць падзел краін на два супрацьлеглыя лагеры. Шостая сесія Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіла ўтварэнне Наркамата замежных спраў рэспублікі, узначаліў яго Кузьма Венедыктавіч Кісялёў (сакавік 1944 г.). Ён жа — кіраўнік урадавай дэлегацыі Беларусі ў Сан-Францыска для ўдзелу ў прыняцці статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (красавік 1945 г.). У склад дэлегацыі ўваходзілі: вядомы вучоны генетык А.Р. Жэбрак, пісьменнік Міхась Лынькоў, гісторыкі В.Н. Перцаў, Ф.П. Шмыгаў і іншыя. 18 лютага 1945 г. у Прусіі быў смяротна паранены галоўны вызваліцель Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, камандуючы 3-м Беларускім фронтам Іван Данілавіч Чарняхоўскі. Пахаваны ён у Вільнюсе, яго імем названы горад (Чарняхоўск) у Калінінградскай вобласці... 26 чэрвеня 1974 г. Мінску прысвоена ганаровае званне «Горад-герой». Чаму такім доўгім аказаўся шлях да гэтай узнагароды — пытанне, на якое яшчэ няма поўнага адказу...


Мінск. 3 ліпеня 1944 г. На трыбуне каля Дома ўрада.

У канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя былы камандзір 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады, Герой Савецкага Саюза (1944) Віктар Ільіч Лівенцаў пабываў у шэрагу еўрапейскіх краін. Вярнуўшыся, ён у лісце да першага сакратара ЦК КПБ К.Т. Мазурава выказаў крытычныя заўвагі наконт увекавечання гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (у параўнанні з тым, як гэта робіцца ў Польшчы, Італіі, Югаславіі, Чэхаславакіі і іншых краінах). Сярод іх: няпоўнае адлюстраванне ў літаратуры актыўнай вызваленчай барацьбы беларускага народа супраць фашызму і гітлераўскай Германіі, слабае раскрыццё дзейнасці Мінскага, Аршанскага і Жлобінскага падполляў, недастатковая прапаганда імён воінаў і партызанаў, якія здзейснілі на тэрыторыі Беларусі выдатныя гераічныя подзвігі... Аўтар звароту прапанаваў стварыць у рэспубліцы спецыяльны саюз — камітэт ветэранаў вайны. «Такая арганізацыя, — напісаў ён, — змагла б дапамагчы мясцовым савецкім органам у паляпшэнні працы з інвалідамі вайны і дзецьмі-сіротамі, у наладжванні больш эфектыўнай дзейнасці па ўвекавечанні памяці воінаў і партызанаў, якія асабліва вызначыліся ў гады вайны».

Спасцігаючы актуальныя пытанні вызвалення Беларусі, нам здаецца, што мы ўжо да ўсяго дакапаліся, усё зразумелі. Але гэта не так. Да многіх праблем гісторыі мы толькі дакрануліся. Іх вывучэнне, што грунтуецца на дакументах, працягваецца.

**Яўген БАРАНОЎСКІ,**
**кандыдат гістарычных навук.**


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1.** **Аппарат для стыковой сварки труб «Ровелд Р250А2», инв. №09157, начальная стоимость лота 38 478 268 рублей.** **Лот №2.** **Трактор «Беларус МТЗ 82.1», рег.знак 3030ВА, 2004 года выпуска, инв. №08107, начальная стоимость лота 15 361 705 рублей.** **Лот №3.** **Автомобиль «Volkswagen Transporter», рег.знак 6148 ВМ-2, 1999 года выпеуска, инв. №09155, начальная стоимость лота 40 949 977 рублей.** **Лот №4.** **Дистанционный лазерный измеритель, инв. №09226, начальная стоимость лота 3 127 375 рублей.** **Лот №5.** **Автомобиль «Ауди А6», рег. знак 5772 АР-2, 2002 года выпуска, инв. №09047, начальная стоимость лота 22 408 700 рублей.** **Лот №6.** **Полуприцеп «ОДАЗ», рег. знак А5120А-2, 1987 года выпуска, инв. №09232, начальная стоимость лота 20 430 632 рублей.** **Лот №7.** **Мойка высокого давления «Vrand», инв. №09121, начальная стоимость лота 12 868 555 рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | КУП «Волынецкое ПМС» (Верхнедвинский р-он, д. Волынцы, УНП 300433113). |
| Местонахождение имущества | Верхнедвинский р-он, д. Волынцы. |
| Наличие обременений | Залог ОАО «БПС-Сбербанк». |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 323 24 июля 2015 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 323 Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел. (0212) 60 09 09. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 16.00 23 июля 2015 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# «ДА ВАЙНЫ СВЕТ ДРЭННА ВЕДАЎ БЕЛАРУСЬ...»

## Пра што пісала «Звязда» 3 ліпеня 1945 года

**Нумар газеты, што выйшаў 70 гадоў таму, быў прысвечаны першай гадавіне вызвалення Мінска і краіны. На старонках змяшчаліся віншаванні нашаму народу, дасланыя маршаламі Савецкага Саюза, народнымі артыстамі і мастакамі, а таксама ўспаміны, артыкулы, нарысы, прысвечаныя вызваленню. Гэта быў першы святочны нумар газеты, прымеркаваны да Дня вызвалення.**




### РАЗМАХ БІТВЫ, ШТО ЗДЗІВІЎ УВЕСЬ СВЕТ

«У Вялікай Айчыннай вайне беларускі народ праявіў сапраўдны масавы гераізм, — пісала «Звязда» ў вітальным слове да чытачоў. — У барацьбе з ненавіснымі нямецкімі захопнікамі вызначыліся не адзінкі і нават не сотні, а сотні тысяч людзей — палкіх савецкіх патрыётаў <...>. З дня вызвалення беларускай зямлі мінуў год. І за гэты год працоўныя Савецкай Беларусі [тут і далей арфаграфія і пунктуацыя захаваны. — **Аўт.**] дасягнулі значных поспехаў у адраджэнні сваёй гаспадаркі, разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З дапамогай вялікага рускага народа, з дапамогай усіх народаў Савецкага Саюза беларускі народ прыняўся за выкананне гістарычнай задачы па ліквідацыі вынікаў нямецкага гаспадарання».

З гадавінай вызвалення Беларусь павіншавалі маршалы Савецкага Саюза Георгій Жукаў, Аляксандр Васілеўскі, генерал арміі Іван Баграмян, двойчы Герой Савецкага Саюза, контрадмірал Іван Папанін...

Маршал Савецкага Саюза Канстанцін Ракасоўскі даслаў артыкул пад назвай «Гістарычная бітва за Беларусь».

«Размах бітвы за Беларусь, тэмп развіцця наступлення сваёй нябачанай грандыёзнасцю, няўхільна нарастаючай сілай, імклівасцю нашых удараў здзівілі ўвесь свет, — пісаў маршал. — Наступальныя аперацыі за вызваленне Беларусі ў чэрвені — ліпені 1944 года з'явіліся пачаткам агульнага летняга наступлення Чырвонай Арміі. Нямецкае камандаванне, лічачы Беларускі фронт найважнейшым напрамкам, трымала тут вялікую колькасць войск, так званую цэнтральную групу арміі, пад камандаваннем генерал-фельдмаршала Буш».

Празаік і публіцыст Ілья Эрэнбург даслаў у святочны нумар свой нарыс пад назвай «Верная сярод верных».

«Да вайны свет дрэнна ведаў Беларусь, — канстатаваў аўтар. — Я памятаю, як французскія газетчыкі блыталі словы «беларусы» і «белыя рускія». У той жа Францыі праз некалькі год падпольныя газеты пісалі: «Мы павінны натхняцца геройствам беларусаў» — свет, нарэшце, даведаўся, што такое Беларусь! <...> Верная сярод верных, будзь благаслаўленна, Беларусь! На тваім целе многа-многа ран. На тваім чале больш за ўсё лаўраў. Ніколі Радзіма не забудзе тваіх партызан, якія ператварылі зялёныя пушчы ў непрыступныя совецкія краі».

### ПРАЙШЛІ ПЕХАТОЮ 150 КІЛАМЕТРАЎ ЗА ДВА ДНІ

Нарыс А. Кандрацкага «Яны былі першымі» прысвечаны танкістам Тацынскага гвардзейскага корпуса, якія за два дні наступлення па Мінскім напрамку прайшлі лясамі і балотамі больш за 150 кіламетраў.

«Мне хочацца расказаць аб танкістах гэтай брыгады, імёны якіх дастойны быць напісаны на першай старонцы гісторыі вызвалення Совецкай Беларусі, — прызнаецца аўтар і працягвае: — Іх трое. Рускі Кузьма Філімонаў, беларус Алесь Басак і ўкраінец Іван Чмель. Простыя совецкія людзі. Да вайны адзін з іх працаваў на трактары на палях Тамбоўшчыны, другі — рамантаваў электраматоры ў Полацку, трэці — працаваў старшынёй сельрады на Палтаўшчыне. Сустрэліся яны ў цяжкія для радзімы дні, пад Сталінградам і селі ў адзін танк: Басак — механікам-вадзіцелем, Чмель — камандзірам машыны, Філімонаў — стралком-радыстам.

<...> На подступах да Мінска на машыну Івана Чмеля напалі тры нямецкія танкі. Гвардзейцы прынялі бой. Метка біла іх гармата. Два нямецкія танкі падбіты. На дапамогу ворагу падаспелі яшчэ тры машыны. Становішча рабілася цяжкім. Але адступаць тады, калі беларус Алесь Басак ужо бачыць трубы Мінскага радыёзавода? Ніколі! І Басак націскае на педалі, машына рвецца ўперад. Меткі стрэл, і загараўся трэці варожы танк. Астатнія павярнулі назад. Гэта была апошняя перашкода на шляху да Мінска».

### «ВЯЛІКАЯ ПРАЦА ЎПЕРАДЗЕ...»

Артыкул Якуба Коласа «Жыві, Беларусь!» прасякнуты радасцю — родная зямля вызвалена ад захопнікаў, ужо год як ідзе аднаўленне прадпрыемстваў, калгасаў, адбудоўванне гарадоў і вёсак.

«Першая гадавіна вызвалення нашай сталіцы застае нас у самым разгары адбудавання краіны, — заўважае Якуб Колас. — Вырваўшыся з нямецкай нявол і, народ наш прагна, як да жыватворчай крыніцы, кідаецца да ачагоў свае совецкае культуры. Ужо шмат чаго зроблена за гэты час, але вялікая праца чакае нас уперадзе, шмат цяжкасцей нам трэба пераадолець».

### ЗАВОД-ВОІН

У святочным нумары «Звязда» пісала не толькі пра подзвіг воінаў, што вызвалілі краіну, але і пра гераізм тых, што працавалі ў тыле. Завод «Гомсельмаш» у гады Вялікай Айчыннай вайны быў у эвакуацыі. У расійскі горад Курган прыбыло 1100 вагонаў з абсталяваннем, нясконачанай прадукцыяй, маёмасцю Гомельскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання. Усё гэта паступіла на базу Курганскага машынабудаўнічага завода. Разам з абсталяваннем прыбыло 290 кадравых рабочых, 135 інжынерна-тэхнічных работнікаў і 43 служачых. Нарыс «Завод-воін» В. Ляўкова расказвае аб працы «Гомсельмаша» ў Сібіры.

«У спякотнае, гарачае лета, тры годы назад, вось па гэтай жа самай дарозе Барыс са сваімі сябрамі па станку, па рабоце, ехаў на платформе таварнага поезда, які ішоў на ўсход. І разам з ім і яго сябрамі на шматлікіх платформах ехаў, звязаны і ўскладзены ў вялікія драўляныя скрынкі, іх родны завод. Кожны дзень прыносіў трывожныя ваенныя весткі. Вораг падыходзіў да сцен старажытнага горада, таго горада, які давялося Барысу пакінуць.

<...>...Людзі, здавалася, наскрозь угрызаліся ў мёрзлую зямлю, Сібірскі мароз трашчаў, а яны, з галавы да ног пакрытыя інеем, нястомна даўблі зямлю. І станкі, машыны зноў вярталіся да жыцця на новай зямлі».

### «ГОСПАДЗІ, ВЫРАТУЙ НАШЫ ДУШЫ!»

Дакументальнае апавяданне «Хлеб» М. Вішнеўскага прысвечана тым беларусам, што ў гады вайны былі вывезены ў Германію на працу.

«Рускіх і беларусаў, украінцаў і палякаў, славакаў і французаў — усіх іх немцы гналі з сабою на захад. І чым ясней ззаду чуваць быў грукат фронту, тым выразней клалася пячатка разгубленасці і жаху на твары немцаў і затоеная светлая радасць на твары палоннікаў. Падганяемыя гэтым жахам, хутчэй рухаліся фурманкі, але ж больш павольнай рабілася хада здарожаных жанчын і падлеткаў, дзяўчат і юнакоў, якіх чорны лёс занёс на гэтую праклёную нямецкую зямлю. Употай яны аглядаліся назад, цяжка ўздыхалі.

— Хутчэй бы! — гаварыла не па ўросце дробная дзяўчына з Магілёўшчыны Антаніна Ганецкая.

— Госпадзі, выратуй нашы душы! — крысцілася на ўсход пажылая Ганна Гаваркова з Гомельшчыны».

### «ТЫСЯЧЫ ЧЫРВОНЫХ СЦЯГАЎ»

Не забыла газета расказаць і пра тое, як упрыгожылі сталіцу БССР да Дня вызвалення.

«Учора вечарам у Мінску ярка і весела загарэліся святочныя агні. Пасля чатырохгадовага перапынку зноў заіскрыліся шматлікія электрычныя лямпачкі па Савецкай вуліцы, па вуліцы Карла Маркса, Комсамольскай, Чырвонаармейскай, на плошчы Леніна і Цэнтральным скверы, у парку культуры і адпачынку імені Горкага. Мінск, кожны яго жыхар, як і ўсе працоўныя нашай рэспублікі, адзначае слаўную гадавіну. На плошчах, вуліцах, над дамамі, установамі — усюды палыхаюць тысячы чырвоных сцягаў. Многія дамы ўпрыгожаны зяленню, жывымі кветкамі. Усюды плакаты, лозунгі, транспаранты».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# З ГОНАРАМ І ЎДЗЯЧНАСЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На досвітку 2 ліпеня 1944 года экіпаж Маторына захапіў нямецкі «Тыгр», які не здолеў перабрацца праз ручай Бродня на заходні бераг. Тры члены экіпажа варожага танка стаялі па пояс у вадзе. Камандзір і механік-вадзіцель сядзелі ў «Тыгры». Рухавік працаваў на ўсю моц. Таму падысці незаўважанымі нашым танкістам было нескладана. Яны спыніліся ў 300 метрах — і вораг быў знішчаны. Танк у якасці трафея забралі з сабой. Раніцай 3 ліпеня, як толькі пачало ўзыходзіць сонца, экіпаж тараніў самаходную прыладу «Фердынанд».

— Калі вызвалілі Астрашыцкі Гарадок, гэты «Фердынанд» спрабаваў перагарадзіць шлях нашай брыгадзе і знішчыць усіх танкістаў, — расказвае Аляксандр Фёдаравіч, які тады быў начальнікам штаба 2-га танкавага батальёна. — Экіпаж Маторына мы ўперад адправіць не маглі: пасля знішчальнага ўдару ім трэба было прыйсці ў сябе. Танкісты рухаліся трэцімі. Напераздзе ішоў экіпаж малодшага лейтэнанта Зайца. На дарозе на Радашковічы натрапіў на нямецкую «Пантэру». Напэўна, экіпаж спаў, бо Заяц сходу знішчыў яе. Восем кіламетраў баявы дазор прасоўваўся па гэтай дарозе і выйшаў восьна гэтую паляну.

Ветэран пайшоў да месца, дзе 3 ліпеня 1944 года на подступах да Мінска разгарнулася танкавая бітва, у якой ён браў непасрэдны ўдзел. Напераздзе рухаўся малодшы лейтэнант Заяц, — кажа Аляксандр Фень. — Дайшоў да гэтага месца і пачаў разварочваць у кірунку вёскі Беларучы. За ім ішоў танк Гарачава, за вежай якога сядзеў я. Мне было загадана ехаць з гэтым дазорам: трэба было вучыць моладзь. Толькі мы сюды выйшлі, як нямецкія танкі зрабілі два выстралы. Нашы танкі гарэлі як запалкі. Маторын меў права даць каманду выскачыць з палаючага танка, але гэтага не зрабіў. Убачыўшы, адкуль страляюць немцы, даў каманду зараджальніку — і з яго танка, ахопленага полымем, былі знішчаны тры танкі ворага».

Усе члены экіпажа — Маторын, Пятроў, Карагодзін і Разуваеў — былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Пасмяротна. За той бой Зорку Героя — таксама пасмяротна — атрымаў механік-вадзіцель 277-га танкавага батальёна Рыгор Зубаў. Ён паспеў выскачыць з танка, але яго напаткала варожая куля. Нямала палеглых было ў тым баі. З усяго батальёна засталося 5 танкаў і каля 20 чалавек. Але групоўка гітлераўцаў была знішчана.

Аляксандру Феню даручылі камандаваць трыма танкамі з пяці. Шлях трымалі на Заслаўе і Ракаў. Трэба было перакрыць дарогу фашыстам, якія адступалі з Мінска.

— Бездарожжа, ішлі па забалочаных мясцінах, — успамінае ўдзельнік вызвалення сталіцы.

У той жа дзень танкавая брыгада Аляксандра Феня авалодала Заслаўем. Разагналі каля 400 гітлераўцаў, больш за 60 паліцаяў. Там жа выратавалі савецкіх дзяўчат, якія былі загружаны ў пяць вагонаў. Цягнік цудам затрымаўся на станцыі. «Раскруцілі дрот, якім былі зачынены вагоны, а яны як высыпалі адтуль! — успамінае ён. — Насупраць выскачыла дзяўчынка, ляціць да мяне, павісла на шыі і плача ва ўсю. А ў мяне самога слёзы цякуць...»

Пра гэта Аляксандр Фёдаравіч аднойчы расказваў у заслаўскай школе. Пасля адзін хлопчык спытаў у ветэрана: «А ці прыгожая была тая дзяўчынка?» — «Прыгожая, — адказваў яму танкіст, хоць твар яе мала і бачыў, а потым дадаў: — Прыгожая, бо наша, савецкая».

За беларускую наступальную аперацыю «Баграціён» ветэран атрымаў ордэн Аляксандра Неўскага. Толькі які шлях ён прайшоў да гэтай знакавай падзеі! Аляксандр Фёдаравіч Фень — камандзір танка ў Сталінградскай бітве, удзельнік бітвы пад Курскам. Вызваляў Украіну, Беларусь, Румынію, Літву, Латвію. Скончыў вайну непадалёк ад Гдыні. За гады ваеннага ліхалецця асабіста знішчыў 12 танкаў праціўніка. Генерал-маёр у адстаўцы ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I-й і II-й ступені, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй» і іншымі. Усяго на парадным кіцелі франтавіка — 7 баявых ордэнаў і 28 медалёў!

...Мы зноў стаім ля помніка аднапалчанам. На ім — прозвішчы тых, хто загінуў на гэтай паляне, толькі дзень не дажыўшы да вызвалення Мінска. І я ўдзячна Аляксандру Фёдаравічу, што ён, у 91-гадовым узросце, не толькі стаў ініцыятарам гэтай ідэі, а яшчэ і арганізаваў цырымонію ўшанавання танкістаў. З аркестрам, урачыстымі залпамі, з ускладаннем вянкоў... Думаю, гэтыя векавыя хвоі не памятаюць падобнага. Як не чулі і аповедаў ветэрана, які 71 год таму таксама быў на гэтай паляне. Перамог і выжыў. Дзякуй яму за Перамогу!

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Факсимильный аппарат (Panasonic) KX -FT932,** начальной стоимостью 1 520 000 рублей;<br>**ПЭВМ (системный блок, монитор LG Flatron L192WS, клавиатура, мышь),** начальной стоимостью 1 600 000 рублей;<br>**Принтер Samsung ML-1250,** начальной стоимостью 200 000 рублей;<br>**Электрический вентилятор Ufesa Alisse,** начальной стоимостью 104 000 рублей;<br>**Электронные весы ВР 4149-11БР, №01557,** начальной стоимостью 600 000 рублей;<br>**Кассовый аппарат ЭКР 3110Ф,** начальной стоимостью 1 168 000 рублей.<br>Торговые стеллажи в ассортименте;<br>Кухонная утварь в ассортименте (кастрюли, сковороды, сотейники, наборы ножей, чайники, наборы стаканов, рюмок, тарелки);<br>Сувенирная продукция в ассортименте;<br>Наборы постельного белья в ассортименте;<br>Детские игрушки в ассортименте.<br>Более подробная информация о торгах и перечне реализуемого имущества размещена на сайте Министерства юстиции Республики Беларусь www.vitebskjust.gov.by/ru/ |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧТУП «Волшебная Дафина»<br>(ул. Молокова, 17, г. Орша). |
| **Местонахождение имущества** | г. Орша, ул. Молокова, 17. |
| **Наличие обременений** | Не имеется. |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 323<br>17 июля 2015 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 323<br>Судебный исполнитель<br>Деревнин Сергей Евгеньевич, тел. (0212) 60 09 09.<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 16.00 16 июля 2015 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# З АГУЛЬНАЙ КУПЕЛІ

## На свяце моладзі асілкі з трох краін зрушылі камбайн

**Пад дэвізам «Перамога — адна на ўсіх» у 47 раз моладзь суседніх краін сабралася ў беларускім райцэнтры Лоеве, з цэнтральнай плошчы якога бераг Украіны — як на далоні. Менавіта так яго бачылі 70 гадоў таму і савецкія салдаты, якія фарсіравалі Днепр, вызваляючы СССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Ва ўсіх афіцыйных прамовах у новым кантэксце ўсе ўзгадвалі вайну і моладзь:

— Будучыня славянскай садружнасці шмат у чым залежыць ад новых пакаленняў, — падкрэсліў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК.** — Нашай моладзі па сілах захаваць і прымножыць дасягненні бацькоў, зрабіць свой годны ўнёсак ва ўмацаванне сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу і сяброўства паміж славянскімі народамі. Славяне — тыя людзі, якія на працягу тысячагоддзяў падтрымлівалі і ставіліся адзін да аднаго, як да братоў. Паселішчы, размешчаныя на гэтым гістарычным месцы, у розныя стагоддзі належылі Чарнігаўскаму і Кіеўскаму княствам, уваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Расійскай імперыі, а з 1926 года — Беларусі. Гэта бясспрэчна сведчыць пра радавое адзінства нашых народаў.

Цырымонія ўскладання афіцыйнымі дэлегацыямі кветак да адноўленай стэлы мемарыяльнага комплексу, урачысты мітынг, выстава рэтраааўтамабіляў, бітва дыджэяў і работа «Горада майстроў» — гэта далёка не ўсе мерапрыемствы, сведкамі і ўдзельнікамі якіх змаглі стаць жыхары і шматлікія госці Лоева.

Аднаznačна прыцягнула ўвагу спартыўна-сілавое шоу «Асілкі». Тры каманды: беларусы, украінцы і малдаване свае фізічныя магчымасці дэманстравалі не толькі ў спаборніцтве паміж сабой, але і з магутнай сельскагаспадарчай тэхнікай. Напрыклад з камбайнамі «Палессе» вагой 16,5 тоны. «Даводзілася рухаць з месца і больш важкія машыны кшталту 25-тонных тракаў», — расказвае спартсмен-асілак Андрэй Булаўскі. Ён разам з Андрэем Фёдаравым са Смалявіч прыехаў на гэтыя незвычайныя спаборніцтвы:

— Але ж камбайн ніхто дагэтуль не спрабаваў цягнуць. Машыну грузавую нашмат лягчэй. У камбайна колы розныя па велічыні і з вялікім пратэктарам. Да таго ж нагрэты асфальт.

Урэшце, найлепшы вынік па буксіроўцы беларускага камбайна прадэманстравалі ўкраінцы. Найхутчэй за ўсіх на пяць метраў яго зрушылі з месца Сяргей Панамароў і Аляксей Новік — за 28,01 секунды. На другім месцы каманда Беларусі. Андрэй Булаўскі і Андрэй Фёдараў справіліся з задачай за 32,81 секунды. Трэцяе месца ў малдаван. Сяргей Мырзенка і Вадзім Смаляк адбуксіравалі камбайн за 47,61 секунды. Дарэчы, падчас спаборніцтваў волаты імкнуліся падтрымліваць адзін аднаго, нягледзячы на прыналежнасць да розных краін.

Літургію, якая прайшла пад адкрытым небам, узначаліў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел. Ён падкрэсліў, што моладзежны фестываль на Лоеўшчыне сведчыць пра тое, што мы адзін народ:

— У нас адна вера, адзін Бог, адна Царква. Мы нарадзіліся ў агульнай Дняпроўскай купелі. Усе тут разумеюць сілу адзінства, сілу згоды і аднадумства. Сабраліся тут, каб засведчыць усяму свету: мы не спрабуем паставіць пад сумненне незалежнасць нашых дзяржаў, але мы адзіны ў Богу. Хочацца, каб усе памяталі: пакуль мы разам, мы моцныя.



Камбайн рухаюць украінцы Сяргей ПАНАМАРОЎ і Аляксей НОВІК.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*astashkevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.42 | 21.44 | 17.02 |
| Віцебск — | 4.24 | 21.42 | 17.18 |
| Магілёў — | 4.32 | 21.34 | 17.02 |
| Гомель — | 4.38 | 21.22 | 16.44 |
| Гродна — | 4.59 | 21.58 | 16.59 |
| Брэст — | 5.09 | 21.49 | 16.40 |

### Месяц

*Поўня ў 4.19.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

***Пр.** Варлама, Засімы, Івана.*
***К.** Карыны, Мары, Пятра.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 2 ЛІПЕНЯ

**1920** год — у Віцебску нарадзіўся Міхаіл Аркадзевіч Лісіцын (Майсей Айзіковіч), музыкант, дырыжор, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі. З 1946 года артыст Дзяржаўнага народнага аркестра Беларусі. Кіраўнік аркестраў, у тым ліку аркестра народных інструментаў БДУ (1963—1980). Аўтар аранжыровак твораў музычнай класікі і беларускіх кампазітараў для аркестра народных інструментаў.

**1925** год — нарадзіўся Патрыс Лумумба, першы прэм'ер-міністр Рэспублікі Конга (цяпер Дэмакратычная Рэспубліка Конга), нацыянальны герой краіны.



**1970** год — у Рагачове адкрыты музей народнай славы. Заснаваны ў 1967 годзе на базе гісторыка-краязнаўчага музея, які дзейнічаў з 1962 года на грамадскіх пачатках. Найбольш цікавыя экспанаты: манетнарэчавыя скарбы, зубы дагістарычнай жывёлы, фігуркі казла і посуд бронзавага веку, лунніца VI ст., інвентар Зборагаўскага пахавальнага комплексу, медальён апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, масонскі знак, рагачоўскі рубель 1918 года, выратавальная камізэлька перыяду Вялікай Айчыннай вайны, вясло алімпійскага чэмпіёна М.С. Гарбачова і інш.

### Было сказана

**Браніслаў ТАРАШКЕВІЧ, пісьменнік, літаратуразнавец, публіцыст, вучоны-мовазнавец, грамадска-палітычны дзеяч, акадэмік НАН Беларусі:**

*«Апошні подпіс і пячаць на дыплом гераізму ставіць толькі смерць».*

**У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 4 ліпеня.**

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

ВІЛЫ. Гэтая прылада сялянскай працы ў народнай культуры разам з іншымі вострымі жалезнымі прадметамі (нож, каса, серп і інш.) уваходзіла ў лік надзейных абярэгаў.

Часам вілы (дакладней — пару) выкарыстоўвалі для «абароны» сваёй сядзібы ад навальніцы, граду, маланкі. Для гэтага іх выносілі на двор і клалі на зямлю перад парогам хаты крыж-накрыж.

Каб спыніць ураганны вецер, які мог нарабіць шмат шкоды для гаспадаркі: паламаць дрэвы, разбурыць коміны, сарваць стрэхі з хат і інш., выконвалі магічныя дзеянні — у той бок, адкуль чакалі навалу, кідалі вострыя рэчы (нож, сякеру), у тым ліку і вілы.

У традыцыі ўсходніх славян вядома забарона выкарыстоўваць відэльцы і нажы падчас калядных святочных вечароў, на вялікодным тыдні, на працягу года ў памінальныя дні, каб не нарабіць шкоды памерлым продкам, якія нябачна знаходзяцца за святочным сталом. З той жа нагоды ў святочныя дні забаранялася браць у рукі вілы, працаваць з імі, каб на працягу года не было мору сярод жывёл.

На Палессі лічылі, што ў каровы не будзе прыплоду, калі даваць ёй сена ці салому віламі, лепш рукамі.

У народнай медыцыне знахары для лячэння цяжкіх захворванняў выкарыстоўвалі такі спосаб: над галавой хворага (чалавека ці жывёлы) разломлівалі драўляныя двухрогія вілы для сена, сімвалічна аддзяляючы «хворую» частку ад «здаровай», потым гэтыя часткі спальвалі на купальскім вогнішчы, прыгаворваючы, каб «згарэла» і хвароба.






## УСМІХНЕМСЯ

**Лену ў класе ненавідзелі і хлопчыкі, і дзяўчынкі, таму што ў яе першай выраслі і грудзі, і вусы.**

— Сардэчна запрашаем у Таварыства зануд! Вазьміце сабе крэсла.

— Зрэшты, у гэтага, як вы выказаліся, крэсла, няма спінкі, так што тэхнічна гэта табурэтка.

— Падобна да таго, што ў нас новы старшыня!

**Вось дзяўчаты напампоўваюць сабе грудзі, апранаюць дэкальтэ, міні-спадніцы і шпількі, а потым абураюцца, што мужыкам толькі адно і трэба...**

**Гэты ўсё роўна, што стаяць за прылаўкам з апельсінамі і скардзіцца, што ніхто не пытаецца пра кнігі.**

Словамі «вось такія пірагі» заканчваюць абарону свайго дыплома бакалаўры-кандытары.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.107. Індэкс 63850. Зак. № 2520.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 ліпеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12